Анда Ротэнберг ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ІРЭНА КАНАНЮК ☞ 4

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 3 (2592) Год LI | Беласток, 15 студзеня 2006 г. | Цана 2,00 зл.

Прэм'ер Казімеж Марцінкевіч (ПіС) засеў да каляднай вячэры ў Беластоку з беларусамі: „Я вельмі цешуся, што магу, як гэта часта на Падляшшы, перажываць Раждаство Хрыстова двойчы"...

Месца для кожнага

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Старшыня Рады Міністраў прыехаў у сталіцу Падляшша наканадні праваслаўнага Раждаства Хрыстовага і ў каталіцкае свята Трох Каралёў. Спадарожнічалі яму м.інш. палітыкі з Падляшша — віцэ-маршалак Сената Кшыштаф Путра, міністр сельскай гаспадаркі Кшыштаф Юргель і Ян Дабжынскі, дзень раней назначаны ваяводам, незалежна ад адмоўнай кансультацыі Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі.

У бібліятэцы Універсітэта ў Беластоку прэм'ер Марцінкевіч прадставіў планы выраўноўвання шанцаў ваяводстваў Усходняй сцяны. Чаму якраз аб гэтым гаварыў ва універсітэцкай бібліятэцы?

— Бібліятэка гэта сэрца, храм вучэльні. А вышэйшая школа — найважнейшае месца развіцця рэгіёна.

Прыпомніў аб падрыхтоўцы спецыяльнай еўрасаюзнай праграмы развіцця ваяводстваў усходняй Польшчы. Агулам гэта 880 млн. еўра на 2007-2013 гады. У той час разам з грашыма на іншыя еўрасаюзныя праграмы на Падляшша мае трапіць каля мільярда еўра. Казімеж Марцінкевіч падкрэсліў, што неабходна прыспешыць пабудову дарог Варшава — Беласток (S 8) і Люблін — Беласток — Сувалкі (S 19).

У час сустрэчы з прадстаўнікамі шматлікіх асяроддзяў Падляшша ў палацы Браніцкіх успомніў ён аб трох справах, якія асацыююцца яму з нашым рэгіёнам:

— Першая справа — гэта чысціня. Такія чыстыя лясы і чыстыя азёры і людзі чыстыя ў сваіх думках і сваёй дабрыні. А дасканаленне дзяржавы немагчымае без увядзення чысціні ў публічнае жыццё.

Далей:

— У маім перакананні другое слова, якое асацыюецца з вашым рэгіёнам — гэта патрыятызм. (...). Мусім прышчапіць патрыятызм у польскіх школах, а нават у садках, у польскіх вучэльнях, польскаму маладому пакаленню. Толькі тады выправім Польшчу.

І далей:

— Трэцяе слова, якое кранае падляшскі рэгіён, гэта супрацоўніцтва. Супрацоўніцтва шматлікіх людзей і многіх асяроддзяў, супрацоўніцтва Цэркваў і народаў. Супрацоўніцтва бывае нялёгкае, гістарычна вельмі складанае.

Прэм'ер Марцінкевіч на закрытай сустрэчы ў палацы Браніцкіх размаўляў таксама з кандыдатам беларускай апазіцыі на прэзідэнта Аляксандрам Мілінкевічам. Заявіў аб стварэнні ў найбліжэйшыя тыдні радыёстанцыі вяшчаючай на Беларусь ды забеспячэнні грошай на адпраўленне назіральнікаў з Польшы на беларускія прэзідэнцкія выбары (аб гэтай сустрэчы больш у наступным нумары).

У другой палове дня прэм'ер са світай, прывітаны хлебам і соллю, сустрэўся на каляднай вячэры з прадстаўнікамі беларускіх самаўрадавых, асветных, творчых і навуковых асяроддзяў. Вячэру арганізаваў Беларускі саюз у РП.

— Для нас, беларусаў, і іншых меншасцей на Падляшшы, візіт спадара прэм'ера з'яўляецца вельмі важным сігналам, што вось у адказны, грамадзянскі спосаб хочам бачыць будучыню Рэчы Паспалітай, і што ўсе грамадзяне, незалежна ад нацыянальнасці і веравызнання, маюць шанц у гэтай будове прымаць удзел, — запэўніваў старшыня Беларускага саюза Яўген Вапа.

Прэм'ер Марцінкевіч:

— Гэтыя святы для Польшчы, значыць, для нас усіх тут пражываючых, нясуць з сабою такія жаданні, каб кожнаму ў Польшчы хапіла месца для жыцця, для начлегу, месца для падсілкавання, каб дзяржава была салідарная з кожным грамадзянінам, з кожным чалавекам. Каб не было так, як больш за дзве тысячы гадоў таму, калі Марыя з Язэпам не знайшлі месца ў гасподзе. Каб было так, каб у Польшчы кожны мог знайсці сваё месца. Жадаю, каб кожны з вас адчуваў сябе так, як нованароджаны Ісус, шчаслівы, у цёплых матчыных абдымках.

Пасля вячэры прэм'еру ўручаны былі падарункі. Сярод іх — ікона, падараваная настаяцелем прыхода Прамудрасці Божай а. Анатолем Конахам ды партрэт Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, перададзены Алегам Латышонкам, старшынёй Беларускага гістарычнага таварыства. Яўген Сачко, дырэктар Комплексу школ з беларускай мовай навучання ў Гайнаўцы ўручыў госцю трохмоўны экземпляр „Новай зямлі" Якуба Коласа і падзяку, перш за ўсё, ад імя вучняў, за скарачэнне школьнага года. Кашульку з апошняга „Басовішча" ўручыла Ілона Карпюк, старшыня Беларускага аб'яднання студэнтаў, а кружэлку з царкоўнай музыкай і запрашэнне на сёлетні юбілейны Фестываль царкоўнай музыкі — Мікола Бушко. Была супольная малітва і калядаванне беларускай моладзі з Беластока.

Прэм'ер нанёс таксама візіт епіскапу Беластоцкаму і Гданьскаму Іакаву.

Мацей Халадоўскі

Газавы шантаж ☞ 2

Уладзімір Хільмановіч

Расія, уся гаспадарчая моц якой трымаецца выключна на агромністых прыродных радовішчах і карысных выкапнях, напрыканцы года распачала супраць Украіны сапраўдны эканамічны шантаж. Уся „братэрская любоў" з боку Масквы скончылася адразу пасля аранжавай рэвалюцыі...

Нармальнасць ☞ 2

Ганна Кандрацюк

За гады жыцця ў Беластоку мне давялося бачыць прыгнечанасць і страх у маіх вясковых сяброў. Найчасцей, калі ідзем па адной вуліцы, яны, з жахам уваччу, уцякаюць на другі бок або нервова махаюць рукамі, крычаць што ў іх няма часу. Ведаюць, што нараблю ім быдла, значыць — загавару па-беларуску. А найгорш, калі такая сустрэча адбудзецца ў магазіне ці аўтобусе.

У Дубяжыне ☞ 5

Аляксандр Вярбіцкі

У вёсцы жыве каля двухсот душ, але лік вясковага насельніцтва падае. Ян Авэрчук ужо другі тэрмін абраны гмінным радным у Бельску; калі пачынаў ён свой першы тэрмін, у гміне было дванаццаць тысяч выбаршчыкаў, а цяпер гэты лік упаў да дзевяці тысяч...

На прыходзе ☞ 8

У 2006 годзе настаяцель Стараляўкоўскай парафіі а. Леанід Янкоўскі будзе святкаваць 37-годдзе сваёй душпастырскай службы, з чаго 30 гадоў у Ляўкове. Прыход прыняў ён 1 чэрвеня 1976 года. У Стараляўкоўскім прыходзе меў тады 565 сем'яў і 1 800 душ. Цяпер тут пражывае 260 сем'яў (800 чалавек)...

Каваль ☞ 11

Аляксандр Вярбіцкі

Пасля Орлі паступіў я ў механічную гімназію ў Беласток. Толькі я адзін з Тапчыкал у гімназіі вучыўся; і яшчэ адзін са Спічкоў быў. А на вёсцы тады многа ж здольнай моладзі было...

9 770546 196000

Газавы ключ

Падобна на тое, што 2006 год стане вызначальным у геапалітычных стасунках Расіі і Еўрасаюза, дзяржавамі Усходняй і Сярэдняй Еўропы з аднаго боку і заходнімі багатымі краінамі кантынента. Ключавым пытаннем дачыненняў становіцца гаспадарчая газавая праблема. Калісьці была папулярная такая расійская прымаўка з гульнёй слоў: „Жизнь бьёт ключом (парасійску „ключ" — гэта крыніца) и всё по голове". У першыя студзеньскія дні актуальнасць гэтага выслоўя для Украіны стала надзвычайнай.

Расія, уся гаспадарчая моц якой трымаецца выключна на агромністых прыродных радовішчах і карысных выкапнях, напрыканцы года распачала супраць Украіны сапраўдны эканамічны шантаж. Уся „братэрская любоў" з боку Масквы скончылася адразу пасля аранжавай рэвалюцыі. І гэтак з кожнай краінай, дзе ад улады адхіляецца крамлёўскі марыянетачны рэжым. Усе суседнія народы для Масквы кепскія, адны беларусы добрыя. Толькі наша краіна плаціць па 47 долараў за кубічны метр газу. Гэта самы танны газ і самы дарагі адначасна. Бо за такую „халяву" Беларусь плаціць значна даражэйшымі вартасцямі — стратай гаспадарчай бяспекі дзяржавы, стратай сваёй нацыянальнай годнасці, стратай беларускамоўнай школы, стратай сваёй культурніцкай прасторы і духовасці. На гэтую „танную" газавую трубу Беларусь падсаджана нібы наркаман на іголку. Многа дурману, але фізічнае і псіхічнае здароўе нішчыцца.

Добры для Масквы таксама Узбекістан, асабліва пасля таго як Крэмль дапамог тамтэйшаму дыктатару Карымаву забіць сотні людзей, якія выступілі з пратэстам, прычым нават не пад палітычнымі, а сацыяльнымі лозунгамі. Вось ужо сапраўды — скажы мне хто твой сябар і я скажу хто ты. Маючы „ў руках" Узбекістан, праз які вядуць газаводы з Туркменістана да Украіны, Масква заблакавала стварэнне новага міжнароднага кансорцыума, які гандляваў бы ў Еўропе газам, дастаўленым новым газаводам з Сярэдняй Азіі. Менавіта да такой пабудовы Віктар Юшчанка намаўляў усе зацікаўленыя бакі, у тым ліку немцаў. Украінская ініцыятыва абудзіла значную зацікаўленасць у Сярэдняй Азіі, асабліва ў Туркменістане і Казахстане, дзе ёсць вялікія радовішчы вельмі таннага ў эксплуатацыі газу. Абы зарабіць на экспарце, сёння дзяржавы Сярэдняй Азіі мусяць карыстацца трубамі Газпрама і пагаджацца на ўмовы, якія дыктуе расійскі канцэрн. У сярэдзіне кастрычніка мінулага года ідэя пра дастаўку азіяцкага газу ў Еўропу па-за сеткай Газпрама, аднак, была адсунута. Масква знайшла эканамічныя рычагі, каб націснуць на Туркменбашы. Газпрам падпісаў дамову з Узбекістанам. Дзякуючы ёй, да 2010 года Расія будзе вызначаць колькі туркменскага газу паплыве транзітам праз Узбекістан. Вольнага месца ў трубах будзе няшмат, бо Газпрам пастанавіў павялічыць закупы ўзбецкага газу, які плыве тым самым шляхам, што і газ з Туркменістана. Пастаралася і Нямеччына, якая ўвайшла ў змову з Расіяй. Яны гэтага нават не прыхавалі — прызначэнне Шродэра адным з кіраўнікоў пабудовы іншага газавода праз Балтыйскае мора наўпрост пацвердзіла гэта.

Што б не цвердзілі крамлёўскія прапагандысты, газавая праблема мае найперш палітычны характар. Не трэба быць эканамістам, каб зразумець сутнасць рахункаў і чаму Масква махае сваім „газавым ключом". Гэта проста светагляднае разуменне крамлёўскай чэкісцкай камарыллі, якое яны „ўбіваюць" у народ воклічамі пра Украіну, Малдову, Грузію, што нібыта абкрадаюць бедную альтруістычную матушку-Расію. Крэмль папросту не мае мыслення эканамічнай мэтазгоднасці і дасягнення карысці для ўсіх. Масква стагоддзямі звыкла сама рабаваць іншых і гэтую сярэдневяковую азіятчыну з яе хутка не вытравіць.

Адназначную падтрымку Украіне выказала Амерыка. Прыбалтыйскія краіны, якія перажылі ў нядаўняй гісторыі падобны эканамічны шантаж, таксама разумеюць сутнасць рэчаў. Паглядзім як Заходняя Еўропа засведчыць сваю адданасць ідэям дэмакратыі. Беларусь жа пакуль сядзіць у цяпле і жуе. Дзяржава пакуль знаходзіць шлях да любові народа праз страўнік. Ну а кожны свядомы беларус у стане выявіць сваю мінімальную падтрымку і салідарнасць краінам, што вызваляюцца ад імперскай залежнасці. Прыкладам, як бы наіўна гэта не выглядала, не купляць тавараў расійскай вытворчасці, а аддаваць перавагу ўкраінскім і малдоўскім прадуктам. Шчэ нэ змэрзла Украіна!

Уладзімір Хільмановіч (Гродна)

У бок цудоўнай нармальнасці

Перад Калядамі на вуліцы, я наткнулася на сяброўку.

— Я ўсё думала, каб нам сустрэцца перад Новым годам, — заявіла першая Наталля К. — Ну, каб сказаць яшчэ словы на свята Хрыстовага Нараджэння.

На свеце быў ужо трэці студзень, на слізкіх ды не расчышчаных тратуарах валялася каляровае смецце ад феерверачнага шаленства.

Я адчула як раптам мне пацяплела на душы, бо тут спрацавала цудоўная тэлепатыя. Вось у апошнія дні я таксама думала пра сустрэчу з Наталляй, вядома, каб павіншаваць яе са святам і Новым годам. Чамусьці ў гэтым годзе я заўпарцілася адсвяткаваць адно Новы-стары год.

З Наталляй і яе сястрой Магдай я пазнаёмілася на сакольскім паломніцтве. З першага слова мы пачалі размаўляць па-беларуску, неяк шчыра, без хітрасці паміж словамі і пачуццямі. Сёння ведаю, што дзяўчаты захапілі мяне праўдзівасцю. У іх індывідуальнасці неяк гарманічна спалучаліся рысы правінцыі (у добрым сэнсе) і метраполіі. Ну і яшчэ адна дэталь, якая заўсёды мяне захапляе — дзяўчаты спявалі ў царкоўным хоры.

— Каб вашы святы былі такія, як у старых царкоўных кніжках! — пажадала мне і маёй сям'і Наталля.

Ад прыгажосці пажаданняў мне закружылася ў галаве. Не было шанцу аддзячыць падобнай фразай.

Пішу пра сустрэчу на вуліцы, бо яна павярнула мае думкі ў бок цудоўнай нармальнасці. „Да шчасця, — думала я сабе, — хопіць трапіць на падобны пераказ эмоцый ды паразмаўляць пасвойму. Інакш дыхаеш, інакш бачыш. Родная мова — гэта не банал, гэта душа, асабісты купал".

За гады жыцця ў Беластоку мне давялося бачыць прыгнечанасць і страх у маіх вясковых сяброў. Найчасцей, калі ідзем па адной вуліцы, яны, з жахам уваччу, уцякаюць на другі бок або нервова махаюць рукамі, крычаць што ў іх няма часу. Ведаюць, што нарабілю ім быдла, значыць — загавару па-беларуску. А найгорш, калі такая сустрэча адбудзецца ў магазіне ці аўтобусе. Мае сяброўкі адчуваюць сябе спаленымі, іх канфуз цяжка параўнаць да чаго-колечы. Усё зводзіцца да пачуцця бяспечнасці, без якой нельга нармальна жыць. Пасля, калі станем здалёк „ад Беластока", яны просяць прабачэння. Баяцца нашай шматгадовай талерантнасці.

Я не люблю такіх сеансаў, пасля іх млосна на душы. Чалавек пачынае думаць пра канцлагеры.

Беластоцкі страх характэрны не адно простым і неадукаваным прасцячкам. Літаральна на днях я перажыла іншы шок. Мой сябра, якога ведаю ўжо пяць гадоў, раптам пачаў размаўляць па-беларуску. Я ведала толькі, што ён гарадскі праваслаўны. Вопыт падказваў мне, што ён — ахвяра асімілятарскіх працэсаў. А тут — калі ласка:

— Ведаеце, — заявіў ён пры ўсёй кампаніі, — да сямі гадоў жыцця я ўвогуле не ўмеў размаўляць па-польску!

Прызнанне майго калегі мела свае паслядоўнасці. Калі я сядзела і думала чаго я хачу ад маіх вясковых сяброўак, калі тут баіцца такі рослы і мажны мужчына (рост сябры — 193 см, 105 кг вагі), адазваўся яшчэ адзін католік:

— A wy myślicie, po jakiemu ja rozmawiałem, zanim nie poszedłem do szkoły?

— Po jakiemu, po jakiemu? — дамагалася адказу ўся кампанія.

— Jak po jakiemu. Па-просту.

Пасля прызнанняў мы пачалі спяваць „Ой, ляцелі гусі з броду".

І гэтая якраз песня чамусьці мне падказвае, што чакаюць нас змены, гэтым разам у добры бок.

Мяне не пакідае надзея, што ўсё ж паразмаўляю са сваімі вясковымі сяброўкамі на беластоцкай вуліцы.

Ганна Кандрацюк

Беластоцкі страх характэрны не адно простым і неадукаваным прасцячкам. Літаральна, на днях я перажыла іншы шок. Мой сябра, якога ведаю ўжо пяць гадоў, раптам, пачаў размаўляць па-беларуску. Я ведала толькі, што ён гарадскі праваслаўны. Вопыт падказваў мне, што ён — ахвяра асімілятарскіх працэсаў...

Вачыма еўрапейца

Да Трактата

Трапіла ў мае рукі публікацыя падляшскай Установы камітэта еўрапейскай інтэграцыі: „Co Polacy myślą o Europie?". „Ці Трактат, які ўстанаўлівае Канстытуцыю для Еўропы, можна зразумець, а Еўрапейскі Саюз гэта калектыўная гульня?" — пытаюцца ва ўступе аўтары. Далей змяшчаюць яны ўсялякія даныя, м.інш. Інстытута вывучэння грамадскай думкі „Pentor". Для прыкладу, пералічваюцца агульныя праблемы, якія ў такой самай ступені турбуюць як Польшчу, так і астатнія краіны-ўдзельніцы ЕС. Аказваецца, што ў Польшчы таксама грамадства старэе, наплывае іміграцыя са шмат якіх — як гэта назвалі — адрозных культурных колаў, пакідаюцца традыцыйныя каштоўнасці і маральныя нормы, а ўся еўрапейская гаспадарка становіцца ўсё менш канкурэнтаздольнай у параўнанні з эканомікай ЗША і Японіі. Прытым, у адчуванні большасці палякаў, сусветныя краіны ўсё больш залежныя адна ад адной. Жыхароў РП усё турбуюць апаскі ў сувязі з будаваннем ЕС, а найбольш з адтокам самых здольных людзей з бяднейшых краін у багацейшыя, з магчымасцю выкарыстання слабейшых краін мацнейшымі, з разрастаннем бюракратыі, з канфліктамі па прычыне адрозненняў паміж інтарэсамі паасобных дзяржаў. Паводле аднаго з апытанняў, праведзенага УКЕІ сярод студэнтаў дзяржаўных навучальных установаў (распытвалі студэнтаў з дзесяці акадэмічных цэнтраў), кожны пяты з іх рашуча дэкларуе ахвоту ў будучыні працаўладкавацца ў краіне ЕС іншай чым Польшча.

У Польшчы таксама, у параўнанні з іншымі краінамі, наглядаецца адносна малы давер да еўрасаюзных установаў: Парламента і Камісіі. Найбольшы давер заўважаецца ў Люксембургу, Белгіі, Ірландыі, Славачыне і ў Венгрыі, а найменшы — у Вялікабрытаніі. Польшча за Латвіяй апынулася ны трэцім месцы ад канца. Калі справа ў самім Трактаце, то сярод скептыкаў найбольш папулярная думка датычыць самога факту, што ён непатрэбны: „ЕС мог бы без яго абысціся". Далей пералічваецца тое, што Трактат пазбаўлены практычнага значэння і змяшчае адно агульныя сцвярджэнні, дае прывілеі адным краінам коштам іншых і характарызуецца закрытасцю — нельга ў яго ўвесці змяненні.

Няцяжка пагадзіцца з меркаваннем аўтараў брашуры УКЕІ, што жыхары Польшчы ўсё мала ведаюць аб Трактаце і яго паслядоўнасцях, але таксама і аб Еўрасаюзе, яго ўстановах і яго магчымасцях у сённяшняй сітуацыі, таксама найнавейшай — глыбокага крызісу ЕС. Нашы веды зводзяцца да фінансавых пытанняў наконт, галоўным чынам, індывідуальных даплат для сельскай гаспадаркі ці супольнага фінансавання з ЕС некаторых інвестыцый. У мяне складваецца ўражанне, што па-за фінансава-бытавымі апаскамі (час ад часу, мабыць, і з нейкімі надзеямі з гэтым звязанымі), наша членства ў ЕС і наша ў ім будучыня не перакладваюцца на спосаб і прынцыпы жыцця і сужыцця ўнутры краіны. Аднак, можа гэта і добра, бо ўрэшце ж жыхары Польшчы захоўваюць сваю асобнасць. Абы толькі яе апорай не былі неталерантнасць, шавінізм ці фобіі, якія даюць аб сабе знаць ці то на вуліцах, ці то ў выказваннях некаторых палітыкаў або мясцовых чыноўнікаў і дэпутатаў, як тыя прысвечаныя „блюзнерскаму характару" супрасльскага тэатра „Вершалін" Пятра Тамашука, а публічна агучаныя Збігневам Пукшам — дэпутатам Падляшскага сейміка і падляшскімі сенатарам Янам Шафранцам і дэпутатам Сейма Анджэем Фэдаровічам (усе з Лігі польскіх сем'яў).

Мацей Халадоўскі

Жыццё Анды Ротэнберг — пасма пакут, якія перажывае, але ім не паддаецца, уцякае пад абарону мастацтва — галоўным чынам сучаснага, але толькі самых высокіх палётаў... У 1993 г. выйграла конкурс на дырэктара найславутай польскай галерэі „Zachęta"...

Я — праваслаўная

— Ніхто ў гэта не ў змозе паверыць, ды я — праваслаўная, — прызнаецца хіба найбольш вядомы і выклікаючы мноства рознагалосся крытык мастацтва ў Польшчы Анда Ротэнберг. Гэта яна заўважыла талент і „заапекавалася" ў сусветным маштабе мастаком з Валіл Лявонам Тарасэвічам.

Калі ў апошні час мы размаўлялі, Анда рыхтавала ўнучку Зосю на выхад у царкву на варшаўскай Волі.

— Усе думаюць, што я яўрэйка, ды я не ведаю ідыш, а мая мама была праваслаўнай расіянкай.

Некалькі гадоў таму казала: „Бог — па-над рэлігіяй, а спосабы на вызнаванне Яго — справа выключна культуры. Людзям патрэбная такая ці іншая царква, але ў мяне такой патрэбы няма".

Яе жыццё — пасма пакут, якія перажывае, але ім не паддаецца, уцякае пад абарону мастацтва — галоўным чынам сучаснага, але толькі самых высокіх палётаў. У 1993 г., у нявыяўленых дагэтуль акалічнасцях ва ўласным доме ў Легніцы была замардавана яе маці, Ліда. Пакоіцца яна на вольскім праваслаўным могільніку ў Варшаве. Выпальвала і здобіла фарфор — філіжанкі, сподачкі, зайчыкаў... Прадавала іх дыслацыраваным у Легніцы савецкім салдатам. Неверагодна шмат ела — такая траўма засталася Лідзе ад часоў блакады Ленінграда. У старую сталіцу Расіі спадарыня Ліда трапіла з Новасібірска. Тут у лагеры пазаёмілася з Вольфам — яўрэем з Новага Сонча, якога арыштавалі былі ў Львове і, абвінаваціўшы ў шпіёнстве, вывезлі на Далёкі Усход; пад канец вайны апынуўся ён у Новасібірску. Бацька, якога Андзіна маці назвала пасля Мішам, быў краўцом, атэістам з сацыялістычным ухілам. Год пасля вайны Ліда, „Міша" і маленькая Анда, пачатая ў Новасібірску, разам з іншымі рэпатрыянтамі трапілі ў Шчэцін. Пасля, з-за намовы Вольфа, выехалі ў Новы Сонч, дзе ён прадаў матчын дом, а грошы прайграў у карты. Прайгрываў яшчэ не раз, а на баку зводзіў выпадковых жанчын. Спадарыня Ліда не стрывала. Узяла малую Анду і рушыла ў Легніцу, дзе пражывала яе знаёмая. У школе маленькую Анду настаўнікі пыталіся:

— Ну, дык скажы ўрэшце, якая твая родная мова?

Анда не ўмела адказаць. Тады размаўляла па-руску.

У Новым Сончы дзецярня крычала:

— Анда, дачка саветкі!

Анда, ахрышчаная ў царкве, хацела быць падобная да іншых дзяцей. Сама з сябе пайшла да першага прычасця ў каталіцкім касцёле.

Сёння з моцай паўтарае:

— Я — праваслаўная.

1968 год застаў Анду, студэнтку гісторыі мастацтва, у Варшаве. З таго часу памятае адну пажылую жанчыну, якая на вуліцы наплявала ёй у твар, выкрыкваючы: „Ty, Żydówo!"

Тры гады пасля ў яе, ад маладога літаратурнага і фільмавага крытыка, нараджаецца ейнае адзінае дзіцё, Матэвуш. Праз гады трапіць ён пад уладу наркотыкаў. Пасля прападзе без весткі. Да сёння на паліцыйных інтэрнэт-старонках змешчаны яго здымак з грыфам: „poszukiwany". Паспеў яшчэ паехаць у Новасібірск. Вярнуўся расчараваны. Прабаваў штудзіраваць мастацтва ў Акадэміі мастацтваў у Познані. Гэта было найбольшае каханне Анды. Але для яе таксама была важная праца. Спачатку ў Інстытуце мастацтва Польскай акадэміі навук, пасля ў Міністэрстве культуры. Кіравала варшаўскай галерэяй Саюза польскіх мастакоў. Раней, за першай Салідарнасці, звязалася з апазіцыяй. У час ваеннага становішча апекавалася непакорнымі мастакамі з „Gruppy".

Анда Ротэнберг і васьмігадовы Матэвуш

У 1993 г. Анда Ротэнберг выйграла конкурс на дырэктара найславутай польскай галерэі „Zachęta". У тым самым годзе нажоўнікі зарэжуць яе матулю Ліду. Неўзабаве прападзе сын Матэвуш. Ужо раней распадаюцца сувязі з бацькам Матэвуша і з іншым мужчынам. Даходзіць да буры вакол „Zachęty": памятныя справы з паказам скульптуры рымскага папы прываленага метэарытам, хепенінгам з аблупліваннем бульбы, пратэстам Данеля Альбрыхскага супраць выстаўкі здымкаў акцёраў у фашысцкіх мундзірах. Анда Ротэнберг падаецца ў адстаўку пад прэсінгам кіруючай Польшчай AWS (Выбарчая акцыя Салідарнасць). Анда, аднак, упэўнена ў адным:

— Кожнае мастацтва мае свае правы. Калі гэта мастацтва. Трэба ўмець адрозніць мастацтва ад злоўжывання і выбрыкаў, выпендрошу.

Правы друк намякае, што за дзеяннямі дырэктар Анды Ротэнберг скрываецца жыдоўскі закалот. Захлынае яе лавіна лістоў, ганьбуючых яе, папікаючых у жыдоўстве.

— Я ніколі не хацела жыць у Ізраілі. Калі б я хацела, пакінула б Польшчу ў 1968 г. Была ў мяне такая магчымасць.

Анда Ротэнберг захапілася мастацтвам Лявона Тарасэвіча. У прэстыжнай „Zachęcie" паспела яму справіць агромную выставу. Намовіла сваю сяброўку, рэжысёрку Ганну Владарчык, паставіць фільм аб беларускім мастаку.

Лявон Тарасэвіч: У Анды так культурна складзенае жыццё, што гэта дазваляе ёй глядзець на мастацтва цвяроза і проста выказваць незалежныя погляды, не звязаныя з афіцыйнай прапагандай цяпер ці ў мінулым. Прытым выхавала яна і абараніла два пакаленні мастакоў...

— У Анды так культурна складзенае жыццё, — кажа Лявон Тарасэвіч, — што гэта дазваляе ёй глядзець на мастацтва цвяроза і проста выказваць незалежныя погляды, не звязаныя з афіцыйнай прапагандай цяпер ці ў мінулым. Прытым выхавала яна і абараніла два пакаленні мастакоў.

Тройка ўнучанят, дочкі і сын Матэвуша, бываюць разам з ёю ў Валілах. Анда ў сваім доме на ўскраіне Варшавы паказвае здымкі з Лёнікавага дому. На адным з іх відаць радаснага Матэвушавага сына Кірылу, які захоплены экзатычнымі птахамі з гадоўлі мастака. Кірыла — кропля ў кроплю Матэвуш. Уся тройка ўнучанят аб'ехала з Андай паўсвету. Кожную свабодную хвіліну бываюць яны ў яе доме, так як і іх маці, дзве жанчыны жыцця Матэвуша. У адным з інтэрв'ю Анда Ротэнберг сказала, ужо пасля таго, як сын загінуў:

— Матэвуш, я не думала пра кар'еру, я, проста, хацела быць шчаслівай.

Лявон Тарасэвіч на апошняй выстаўцы „Свята" ў галерэі „Арсенал" у Беластоку

Раіна Стэфанчук

Сюрпрызы

Рэдка карыстаюся паслугамі пошты. Дарагая гэта фірма, ды да кліентаў несур'ёзна ставіцца. Спатрэбілася мне тэкст у рэдакцыю факсам паслаць. Лічыў, што хутчэй будзе. Праз тры дні даручылі. Раней у Беласток пісьмо два дні ішло. Зараз пасля чатырох даручаюць. Калі хочаш „тэрмінова" паслаць, дык трэба два злоты дадаткова заплаціць. Кошты паслуг на пошце ўвялічваюцца, а карысць кліентам — мізэрная. Яшчэ нядаўна ў паштовым аддзяленні ў Чаромсе працавалі тры асобы, зараз — адна. Ды не на адной пошце справа так маецца. Прыкладаў з іншых устаноў хоць адбаўляй.

Чалавек заваёўвае космас. Збіраецца на Месяц паляцець. Штодзень карыстаемся суперсучаснай тэхнікай: камп'ютэрамі, каляровымі тэлевізарамі, сотавымі тэлефонамі і г.д. Чалавека робаты заступаюць. Але хопіць малая аварыя і... тэхніка „моўкне". 30 лістапада падарожнічаў я па Беларусі. Вяртаючыся дамоў праз пагранічны пераход Полаўцы — Пяшчатка прастаяў я на граніцы лішнія чатыры гадзіны. Прычына? Вайскоўцы пагранічнай стражы на польскім баку не маглі дакументаў афармляць, бо... камп'ютэры „завесіліся". Іншы прыклад. У час снежнай буры з 16 на 17 снежня была знішчана электрычная лінія. Абарвалася пастаўка электрычнага току, а тым самым спынілі працу камп'ютэры ва ўстановах, фіскальныя касы ў крамах і супермаркетах, машыны на прадпрыемствах.

Даўней кліент быў залежны адно ад прадаўца ці чыноўніка, а сёння — яшчэ і ад тэхнікі.

Уладзімір Сідарук

Як па бамбёжцы

У снежні ў нашу краіну, у тым і на Беласточчыну, завітала сапраўдная зіма. Пачаў падаць мокры і цяжкі снег, падуў моцны вецер з поўначы і вынік вядомы — у многіх месцах паваленыя дрэвы, парваныя электраправады, паламаныя слупы ліній перадач, высокія снежныя гурбы, што не праехаць, ні прайсці ды многа іншых няшчасцяў. Два дні, а мо і больш, мы былі пазбаўлены электрычнасці і гэта напамінала колішнія пасляваенныя — а нават і міжваенныя — гады. Але ў наш час немагчыма без яе жыць, бо цяпер усё аснована на электратоку; без яго нават вады з водаправода няма. А нашы калодзежы цяпер амаль сухія і ў маім канцы Дубіч — Крынічыне — вада ў зямлі прапала. Бо сухія леткі, замнога равоў на лугах і вясною партачы з Бельска-Падляшскага рамантавалі наш водаправод і месяц часу сваімі помпамі вылівалі з зямелькі ўпустую чыстую крынічную ваду.

Тыя, што былі на прымусовых работах у Прусіі, бачылі, як немцаў бамбілі дзень і ноч, рвалі правады, але праз адну-дзве гадзіны электраток зноў быў; электрыкі зналі сваю справу. А ў нас без вайны не было электрычнасці, а што было б, калі б да нас завітала нейкая палітычная завіруха?

Мікалай Панфілюк

Жывуць з патокам машын

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Солтыс Галадоў Ірэна Кананюк атрымала адукацыю ў Сельскагаспадарчай акадэміі ў Любліне

Калі я праязджаў праз Галады (Бельская гміна), спачуваў жыхарам гэтай вёскі. Яны мусяць штодзень глядзець на паток машын і сачыць за дзеткамі, каб не перабягалі праз вуліцу перад грузавікамі. Апошнім часам большасць прадпрыемстваў перакінулася з чыгуначнага транспарту на аўтадарожны і таму праз Галады часта праязджаюць цыстэрны з бензінам і газам, а таксама велізарныя грузавыя машыны, якія возяць сыравіну і гатовыя вырабы. Праз вёску імчацца легкавыя машыны і аўтафургоны, якія пастаўляюць прадукты з оптавых складоў у магазіны.

Трапнасць маіх разважанняў пацвердзіла старэйшая жанчына, якую я спаткаў на лавачцы побач вялікай вясковай крамы.

— Машыны ездзяць увесь час, днём і ноччу. Дзяцей зараз у вёсцы мала, але трэба пільна сачыць за ўнукамі, якія прыязджаюць адпачываць у час канікулаў. Некаторыя машыны імчацца праз вёску вельмі хутка. Калі здарыцца аварыя, нейкі час вадзіцелі ездзяць спакайней, — кажа Надзея Данільчук.

Многа дамоў пустуе

Побач дома маёй субяседніцы стаіць некалькі моцна знішчаных хатаў. Відаць, што яны здаўна пустуюць. Дамоў пакінутых жыхарамі ў Галадах больш.

— У мінулым у Галадах было каля 100 гаспадарак. Аднак шмат людзей пераехала на пастаяннае жыхарства ў гарады. У многіх дамах асталіся жыць пенсіянеры. Цяпер можа толькі каля дзесяці малодшых гаспадароў асталося працаваць на бацькоўскім полі, — расказвае спадарыня Надзея. — Землі ў нас дрэннай якасці і таму асталіся ў асноўным невялікія гаспадаркі.

Паколькі Галады знаходзяцца непадалёк ад Бельска-Падляшскага, паявілася зацікаўленне гараджан пустуючымі ў вёсцы дамамі.

— Некаторыя хаты купілі жыхары Бельска-Падляшскага. Яны зацікаўлены таксама купляй свабодных участкаў прызначаных пад будову жылля. З нашай вёскі добры даезд у горад і таму ў нас купляюць хаты, — гаворыць Надзея Данільчук.

З Галадоў выводзіўся мастак Пётр Паўлючук, які жыў у Аргенціне. Мае суразмоўцы ведаюць пра яго мала, але выказваюцца аб сваім земляку станоўча.

— Ён маляваў, а ягоны брат Павел нешта з гіпсу выконваў, — кажа Піліп Данільчук, які, падпіраючыся палкай, выходзіць перад свой панадворак.

— Бацька іх быў багатым чалавекам і таму яны школу скончылі. У час вайны Пётр выехаў за мяжу і там астаўся. Жыў у Аргенціне, маляваў карціны, — гаворыць жонка Надзея. — Меў вярнуцца ў нашу вёску і адкрыць музей, але загінуў.

Не рашыліся на традыцыйнае гаспадаранне

Данільчукі перадалі зямлю дзецям і зараз павінны адпачываць.

— Мы гаспадарылі на 18 гектарах зямлі. Было ў нас 4 сыноў і ніводзін не рашыўся застацца на гаспадарцы. Нашае поле зараз ляжыць аблагом, а мы плацім падатак размерам 250 злотых у год, бо зямлі ў нас няякасныя, — тлумачыць спадарыня Данільчук. — Сын, што жыве ў Бельску, пад фольгай вырошчвае агародніну, галоўным чынам памідоры і капусту. Мы з мужам крыху яму дапамагаем. З ранняй вясны трэба пастаянна ацяпляць раслінкі. Мы жывём на месцы, то сочым, каб не загасла ў печцы, з якой цяпло ідзе ў фольгу.

Не атрымалася з калгасам

Надзея Данільчук памятае ваенны і пасляваенны час, калі ўмовы гаспадарання былі вельмі цяжкімі.

— Калгас пачалі арганізаваць у Галадах яшчэ ў саракавым годзе. Гаспадары баяліся ўступаць у яго і таму мала асоб рашылася на калектыўнае гаспадаранне. Тым, што не запісаліся ў калгас, цяжка было гаспадарыць. Поле вакол вёскі забралі ў гаспадароў і перадалі калгасу. Восенню калгаснікі засеялі поле, але сабраць ураджай ужо не змаглі. Тут, дзе знаходзіцца магазін, паспелі яшчэ паставіць канюшню, а аборы ўжо не збудавалі, — успамінае спадарыня Надзея і паказвае на мураваны будынак, які знаходзіцца збоку яе панадворка. — У наступным годзе прыйшлі да нас немцы і людзі пачалі ўбіраць збожжа з палёў, на якіх гаспадарылі да прыходу саветаў. У вёсцы сталі сварыцца і чапляцца да тых, што стваралі калгас. Яны сталі хавацца па хлявах, але людзі не выдалі іх немцам і ніхто не пацярпеў.

Перад прыходам нямецкіх войск савецкія чыноўнікі зрабілі спіскі асоб, якіх мелі саслаць на ўсход. Сярод іх быў бацька Надзеі Данільчук, які не ўступіў у калгас. Аднак савецкія ўлады не паспелі з вывазкай, бо ўспыхнула вайна.

Цяжка гаспадарылася пасля вайны

— Пасля вайны сталі нас намаўляць выязджаць у Савецкі Саюз і 10 гаспадароў рашылася перасяліцца ў суседнюю дзяржаву. Іх поле можна было браць у арэнду або купляць, — гаворыць Надзея Данільчук. — Людзі апасаліся, што вернуцца да нас санацыйныя парадкі і таму выязджалі з Польшчы. Аднак іх апасенні не апраўдаліся і ў нас лепш жылося, чым у Савецкім Саюзе.

Пры народнай уладзе гаспадары Галадоў не згадзіліся другі раз арганізаваць у вёсцы калгас. Аднак тым гаспадарам, у якіх было многа поля, цяжка было гаспадарыць.

— У майго бацькі было тры гектары зямлі і таму нашы падаткі былі невялікія. Сыноў багацейшых гаспадароў забралі працаваць у шахтах. Пасля вайны ніхто з нашай вёскі не пайшоў вучыцца ў вышэйшыя ўстановы. Маладыя паехалі на адукацыю ў вялікія гарады ўжо намнога пазней. Тады таксама многія мужчыны з Галадоў пайшлі працаваць у Бельск-Падляшскі, а іх жонкі асталіся дома даглядаць за жывёлай. Людзі дараблялі таксама працуючы ў лесе, — кажа спадарыня Данільчук. — У шасцідзесятыя і сямідзесятыя гады стала лягчэй гаспадарыць. Мы тады збудавалі хату, хлеў і астатнія будынкі.

Некаторыя паставілі на сельгаспрадукцыю

Зараз у Галадах некалькі асоб вырошчвае агародніну. Апошнім часам паменшала прыбытковасць у гэтым відзе расліннай прадукцыі, але даход ад продажу памідораў ці агурко ў намнога большы, чым ад збожжа, якое цяпер абясцэнілася. Сям'я Кананюкоў, якая ў галоўным займаецца вырошчваннем памідораў, хоча пабольшыць вытворчасць малака. Калі я наведваю солтыса Галадоў Ірэну Кананюк, яе муж якраз прывозіць нядаўна купленую карову. Будуць гадаваць яны 7 дойных кароў. Было б іх больш, калі б у наваколлі вёскі не кралі быдла.

— Дзве каровы ўкралі нам ноччу, а чатыры гады пазней крадзеж дзвюх кароў адбылася днём, — гаворыць усхваляваным голасам Ірэна Кананюк, якая атрымала салідную адукацыю ў Сельскагаспадарчай акадэміі ў Любліне. — Мы думаем, што менш складана будзе займацца прадукцыяй малака, чым вырошчваннем агародніны. Хочам купіць умяшчальнік на малако, бо тады будуць плаціць даражэй за малочную сыравіну.

У Кананюкоў 18 гектараў поля, сярод якога многа непрыдатнай зямлі — пятага і шостага класаў. Шэсць гектараў зямлі падыходзіць толькі пад аблясенне.

Аляксей Мароз

Дубяжын ідзе на пенсію

Дубяжын з боку Падбелля бачыцца вялікай вёскай, у якой вялікія клуні ўнушаюць, што тут жывуць вялікія гаспадары. Галоўная вуліца вёскі доўгая, аднак на той даўжыні не відаць многіх слядоў буйнага гаспадарання: раптам адну ці дзве цяпліцы. Панадворкі наогул абходжаныя, хаця сляды на іх не надта натаптаныя. Хаты ў Дубяжыне ўсялякія, аздобленыя вельмі разнастайным дэкорам.

Кіруюся да солтыса, які жыве ў канцы вёскі, што ад Краснага Сяла. Гаспадара няма дома, але ягоная сямейніца рэкамендуе мне суседа, які з'яўляецца гмінным радным. Перад хатай раднага Яна Авэрчука пыхкае трактар. Мужчыны, калі я ім прадставіўся, адразу адным залпам грымнулі ў маім напрамку дакорам ад варшаўскіх палітычных навін:

— А чаго яны там так кідаюцца да таго Ярузельскага! Калі б не ён, то колькі крыві палілося б тут у Польшчы...

У тутэйшай падсвядомасці цалкам апраўданыя крыніцы трывогі: з пабітых атрадам „Бурага" вазакоў найбольш было з суседняга Краснага Сяла. Вось і людзі тут баяцца раздзірання зажытых ран, баяцца новых неспакояў, бо за іх найчасцей расплачваюцца ў нічым невіноўныя мірныя людзі — так, як гэта было шэсцьдзесят гадоў таму, пры яшчэ не зажытай памяці.

Але пра гэта мы ўжо на вуліцы не гутарылі: трактарыст паехаў у сваю дарогу, а спадар Авэрчук запрасіў мяне дадому, дзе і расказаў мне не надта аптымістычныя звесткі пра Дубяжын.

Амаль цэлая вёска — гэта пенсіянеры. Вось і пад бачанай мною фольгай таксама яны гаспадараць. Адзін гаспадар трымае свіней, двух — па некалькі дзесяткаў авечак. Кароў ва ўсёй вёсцы будзе раптам каля трыццаці; малако ад іх людзі ў Градалі возяць. Амаль усё дубяжынскае поле лесам засаджана, бо землі слабыя, пяты і шосты класы. У самога спадара Авэрчука было каля дваццаці гектараў, з якіх у пераліку на г.зв. разліковыя ўгоддзі аставалася толькі траціна; і сам спадар Авэрчук на структурнай пенсіі, бо свае гектары апісаў на сына. Лепшыя землі былі калісь адвялі пад пэгеэр. Звыш трыццаці гектараў дубяжынскай зямлі абрабляў жыхар Пякутаў, што ў Высокамазавецкім павеце, але зрокся і нехта з Бельска хоча абрабляць тую зямлю. Бо там, пад Замбраў, кажа мой суразмоўца, усе гаспадары маладыя, а ў нас няма варункаў — уся прадукцыя танная. Адзін з актыўнейшых мясцовых гаспадароў нядаўна пакончыў жыццё самагубствам.

На сямідзесяці гектарах за Дубяжынам прадбачваецца наладзіць утылізацыю адкідаў з трох паветаў: Сямятыцкага, Гайнаўскага і Бельскага; можа да гэтага яшчэ далучыцца і Беластоцкі павет. Апрацоўка утылю мела б рушыць у 2010 годзе, але пакуль няма яшчэ канкрэтных праектаў.

Па-рознаму аздобленыя дубяжынскія хаты з'явіліся не ў выніку іх продажу нейкім экзатычным прышэльцам: гаспадарамі ў іх з'яўляюцца найчасцей гарадскія выхадцы з роднай вёскі, а пастаяннымі жыхарамі — іх бацькі. Уласнікі такіх арыгінальных хат жывуць найчасцей у Бельску або ў Беластоку. Аматараў з Варшавы або Шлёнска, якія хацелі б купіць хату ў Дубяжыне, няма. У імпазантнай хаце, абабітай дошкамі з непраставанымі краямі, жыве мясцовы цяперашні земляроб, які шмат гадоў быў у ЗША, дзе запрацаваў пенсію. У іншай хаце, з прыгожа аздобленымі тарцовым дэкорам вокнамі і з елкай за плотам з бетоннага ажуру жыве мясцовы пенсіянер... Пустуе бадай шэсць хат.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Ян Авэрчук

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Мастацтва дэкору

У Дубяжыне дзве крамы, з іх адна прыватная. Будынкі былых асяродка здароўя і школы ўжо ў прыватных руках. Лячыцца трэба ў Бельску, а вучыцца ў Ягуштове, куды школьны аўтобус возіць каля дзесяці дзяцей. У ягуштоўскіх школах вельмі добрыя ўмовы навучання, яны добра аснашчаны, дзеці вучацца толькі на адну змену; вучацца ў Ягуштове нават дзеці з самога Бельска. У Бельск трэба дабірацца на ўласным транспарце; паязды з Падбелля ездзяць рэдка, а пасажырскі аўтобус ад'язджае занадта рана. Іншай нявыгадай дубяжынцаў з'яўляецца тое, што іхняя пошта — у Орлі.

У адным з былых школьных будынкаў — святліца, у якой адбываюцца выбары, дыскатэкі, часам вяселлі. Памінкі ладзяць найчасцей у сваіх хатах, заказваючы абед у Бельску; адтуль нават абслуга прыязджае, дома астаецца толькі, бывае, бульбу наварыць.

Водаправод пампуе ў Дубяжын ваду з недалёкіх Алекшаў. А пра каналізацыю і гутарыць дарма, бо няма дзеля каго яе рабіць. У вёсцы жыве каля двухсот душ, але лік вясковага насельніцтва падае. Ян Авэрчук ужо другі тэрмін абраны гмінным радным у Бельску; калі пачынаў ён свой першы тэрмін, у гміне было дванаццаць тысяч выбаршчыкаў, а цяпер гэты лік упаў да дзевяці тысяч.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Зімою дубяжынскую вуліцу ўпрыгожвае белы снег, вясною ўпрыгожыць яе зелень дрэў

Тэлебачанне дапамагае

У канцы лістапада мінулага года Беластоцкае тэлебачанне паказала клопаты жыхароў калёніі Фальваркі-Тыльвіцкія па прычыне дрэннай дарогі. Жыхары давозяць сваіх дзяцей да шашы Заблудаў — Міхалова, вярхом на конях, каб яны маглі на час даехаць у школу. Наконт гэтай дарогі выказваўся таксама бурмістр Заблудава, які паабяцаў, што зараз з вясны пачнецца пабудова дарогі, каб людзям аблегчыць штодзённае жыццё, і, калі спатрэбіцца, каб магла туды даехаць карэтка хуткай дапамогі, мог дабрацца пісьманосец, ды каб школьны аўтобус забраў дзетак у школу. Вядома, што бурмістр Заблудава чалавек слоўны і калі што-небудзь абяцае, дык напэўна зробіць.

Пішучы гэтыя радкі прыйшла мне ў галаву думка, каб журналісты Беластоцкага тэлебачання наведалі ў будучыні вёскі Бялкі, Агароднікі, Іванкі-Рагазы ды паслухалі выказванняў жыхароў наконт стаўлення самаўрадавых уладаў да патрэб жыхароў. Дырэкцыя ПКС у Беластоку адмяніла курсіраванне аўтобусаў так, што цяпер з горада цяжка дабрацца дадому. Жыхары гэтых вёсак з'яўляюцца таксама падаткаплацельшчыкамі, а чаму маюць быць горшымі за іншых грамадзян? Праўда такая, што гмінным райцам тады патрэбныя сяляне, калі набліжаюцца самаўрадавыя выбары. Тады войт арганізоўвае транспарт, які вязе людзей на выбарчы ўчастак і прывозіць назад дадому. У гэтым годзе адбудуцца самаўрадавыя выбары. Цікава хто тады паедзе галасаваць?

Мікалай Лук'янюк

Набліжэнне свята

Раждаство Хрыстова, а асабліва калядную вячэру, суправаджае цудоўны, непаўторны настрой з няспыннымі ўсмешкамі ад дзіцячых успамінаў. Дзецям — гэта кульмінацыйныя хвіліны шматмесячнага чакання падарункаў, пакладзеных пад упрыгожаную ёлку. Калядная вячэра ў розных краінах мае свае адметнасці.

У Грэцыі гэты вечар праводзіцца галоўным чынам па-за домам, у рэстаранах, барах і начных клубах, або запрашаецца прыяцеляў на познюю вячэру з пікантна фаршыраванага індыка. У Венесуэле ў час каляднай вячэры спажываецца печанае парася з трапічнай агароднінай, стравы з рысам, чорнай фасоляй і жаранымі бананамі. Куцця ў Мексіцы з'яўляецца ўрачыстым сямейным святам, калі старшыну роду наведвае нават некалькі дзесяткаў асоб. У час вячэры, якая пачынаецца апоўначы, сервіруецца рыбны суп з мяснымі кнэдлікамі, печаны індык ды печаныя ў смятане рыбы з бульбай. Многа радасці атрымліваюць асабліва дзеці, да якіх Санта Клаўс прыходзіць аж двойчы: у калядны вечар укідае падарункі праз комін, а ў Вадохрышча кладзе іх у выстаўленыя за акно боты. У Нарвегіі ў Куцю роўна ў 17 гадзін званы па ўсёй краіне абвяшчаюць пачатак вячэры, якая складаецца з рыбных страў і свініны; традыцыя рэкамендуе там нарыхтоўку сямі розных пірагоў.

Міхал Мінцэвіч

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

— 9 —

Пад „стары" Новы год да Гражынчынага таты завітаў сябра з арміі. Жанчынам і не ведаць, што гэта такое — быць сябрам з арміі! Граку таксама не, хоць разумеў, што гэта такое можа быць — мужчынскае сяброўства. Маладыя хлопцы ідуць у армію з прызыву, там становяцца сапраўднымі мужчынамі. Тата прынёс баявік з пазычальні фільмаў, уваткнуў яго быў у відзік, ды не пераканаў нікога аб патрэбе паглядзець „як у морду б'юць" (словы бабулі). Дык Грак глядзеў яго сам днём хвілін дваццаць. „От, бабскае ў мяне выхаванне, не падабаецца мне такое, — падумаў Грак. — Калі б жанчыны кіравалі светам, войнаў не было б..."

Татаў сябра прыехаў у госці на пару дзён. Навёз падарункаў — шукаў па свеце шчасця пару гадоў. Гражынцы прывёз ляльку — забыўся, ці што, што гэта ўжо вялікая дзяўчынка?! Тату дастаўся пісталет на халастыя патроны, маме — тайландская сукенка, добра, што мадэль вельмі шырокая, бо ад часу, калі тата і мама „хадзілі", дык мама моцна паправілася. А бабулю дзядзька Федзя ашчаслівіў хусткай з сапраўднага кітайскага шоўку. Грак доўга таптаўся на парэнчы фатэля, урэшце азваўся:

— Дзядзька Федзя, а мне дык што Вы прывезлі?

— Вы што, так спраўна птушку гаварыць навучылі? — уцешыўся госць і пстрыкнуў Граку каля дзюбы.

— Ну, якое нахабства! — абурыўся Грак. — Усяго вас там у арміі панавучвалі! Бачыў я ў фільме! Граку ў дзюбу даць!

— Ой, прашу прабачэння! Гэта такія чулыя мужчынскія жэсты... А, праўда, сёння ж шчодры вечар! — схамянуўся госць. — Сёння ж нават жывёлы гавораць.

— Нават жывёлы! — надзьмуўся Грак і рашыў быць не менш нахабны. — Ну, што там мне ў падарунку дастанецца?

Усе засмяяліся. Дзядзька Федзя рад не рад расчыніў свой чамадан.

— Вось, вось гэта! — Граку аж цёпла стала ў грудзях. На лакавай талерцы красавалася птушка. Такую прыгажуню толькі ў сне ўбачыць можна...

— Райская птушка. Прывёз я яе з Папуі-Новай Гвінеі. Калі ласка, яна — твая.

Мама павесіла талерку на сцяне каля Гракавай галіны.

— А, мая ты... Папуйка! — Грак ужо і не слухаў успамінаў татавага сябра.

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У беларуска-польскім садочку ёсць нагода пазнаёміцца з мовай, традыцыяй продкаў...

Калядкі ды смачныя аладкі

Як кожны год у беларускім садку адзначылі свята Каляд. З малітвай, калядкамі, абрадавымі стравамі.

— Мы сабраліся ў сваім крузе, — адзначыла Луцыя Неміровіч, дырэктар садка, — дзеці і бацькі. Сёння — 4 студзеня, два дні да сапраўднай Вілеі.

А грамада тут немалая. У садку 54 навучэнцы — па 27 дзетак у малодшай і старэйшай групах.

Усё пачалося з калядак, якія дашкольнікі праспявалі жыва і з прытупам. У рэпертуары з'явіліся народныя шэдэўры як „Тупу-тупу-туп каза", ці „Саўка ды Грышка". Пры іх ногі гоцалі не адно ў маленькіх каляднікаў!

Падрыхтаваліся і бацькі з настаўніцамі. Святочныя сталы ўгіналіся ад смакоццяў. Сярод іх былі абрадавыя стравы, як куцця, аладкі, капуста з грыбамі, рыба і кампот з сушаных яблыкаў і груш.

Вячэра, як мае быць, пачалася з малітвы і прасфоры. Рэлігійны бок урачыстасці павёў бацюшка Андрэй Місяюк, бацька дашкольніка.

— Праз тыдзень сустрэнемся ў шырэйшай кампаніі, — кажуць настаўніцы, — мы падрыхтавалі абрадную сцэнку пра Каляды. Запросім гасцей, сваякоў, сяброў.

— Зараз у нас многа таленавітых бацькоў. І многа — чаго не хапала раней — таленавітых галасістых мужчын.

Сапраўды, кампанія ў прадшколлі маладая і прыгожая. Гутару з мамай Рафала, лекарам-неўролагам:

— Я рада, што мой сын можа хадзіць у беларускі садок, — кажа. — Гэта дар, які магу падарыць свайму дзіцяці.

Сям'я маёй субяседніцы — польскамоўная. У садочку ёсць нагода пазнаёміцца з мовай, традыцыяй продкаў. Калі стаўлю пытанне Рафалу, хлапец адказвае па-беларуску. А ў вачах яго мамы бачу... радасць.

Зорка

Авяр'ян Дзеружынскі

Студзень

Ходзіць
Студзень,
Студзіць
Студзень,
Цэлы месяц
Холад будзе,
Вецер зябкі
Шуміць,
А мароз
Аж трашчыць.
Ды не страшна
Янку,
Коціцца
На санках
З горкі снегавой
Крутой
Разам
З дружнаю дзятвой.
Студзіць
Студзень,
Стыне лес,
Зай пад ёлачку
Залез.
Стаў, нібы
Пад парасон,
У зацішку
Морыць сон.
А спрытнюгі
Курапаткі —
Пад сняжком
Зрабілі
Хаткі
І сядзяць
Уночы,
Заплюшчыўшы
Вочы...
Сняць салодка
І не чуюць
Як вятры
Наўкол сярдуюць.
З маразамі
У гуле-гудзе
Ходзіць
Студзень,
Студзіць
Студзень.

Галерэя „Зоркі” (Бельск)

Аксана Федарук

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні — У шостым класе 5,73, але не думайце, што я зубрыла, гэта няпраўда.

Мая мянушка — „Ксэня”, так кліча мяне мама ў хаце.

У жыцці хачу стаць, чаму — Я хачу стаць архітэктарам, бо я люблю праектаваць розныя дамы. Я ўжо маю некалькі праектаў хат. Я таксама сама „ўставіла” па плане мэблю ў сваім новым пакоі, у якім цяпер жыву. Ён яшчэ няскончаны, але вельмі прыгожы.

У сяброў цаню — Найбольш я цаню шчырасць і сяброў, якія захоўваюць таямніцы. Шаную таксама сяброў вясёлых, з усмешкай. Хіба кожны скажа, што з сумным сябрам няма ўжо такой забавы, як з вясёлым. Мая найлепшая сяброўка здзяйсняе ўсе мае патрабаванні. Я яе вельмі люблю і мы вельмі добра разумеем адна другую.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Не люблю — людзей, якія не ўмеюць стрымаць сваіх абяцанняў. Мне не падабаецца, калі сяброўка сяброўку абгаворвае за плячыма. Не люблю таксама, калі хтосьці нешта абяцае, а потым кажа, што ён нічога не абяцаў і выкручваецца ад таго што ён раней сказаў.

Па-беларуску размаўляю — найбольш на ўроках беларускай мовы. Таксама з бабуляй, дзядуляй і бацькамі. Часта па-свойму гавару з сястрою і цёцяй.

Мой любімы гурт — Я не маю свайго любімага гурту, але часта слухаю „Прымакоў”. Я люблю беларускія песні, бо яны вельмі прыемныя для вуха і я магу іх слухаць надта доўга, напрыклад, з мамай, якая таксама любіць беларускія песні.

Каля свайго дому пасаджу — Я хачу свой дом запраектаваць так, каб навокал яго было вельмі многа дрэў і разнаколерных кветак, якія будуць прыгожа выглядаць улетку, калі ўсе расцвітуць. Тады вельмі прыемна будзе пасядзець на лавачцы ў садку.

Тры Паўліны і Паўл

Дзень да Каляд Паўліна Ш. рашыла абстрыгчы свае косы-”дрэды”.

— Хачу, каб маё жыццё памянялася, — напісала яна ў сваім дзённіку, які вяла ў таямніцы перад сямейкай.

— Я хачу ўрэшце закахацца! І не як раней, значыць, два разы ў тыдзень, толькі раз і дарэчы. Каб не было як да гэтай пары. Значыць, так: закахаешся ў панядзелак, а ў пятніцу заяўляеш сяброўкам... што апошняе пачуццё было толькі і выключна дзеля *гніця*! — Паўліна Ш. мела дзівосныя помыслы: калі хлапец пачынаў ёю цікавіцца, яна пачынала пазяхаць ды аглядацца за іншай сімпатыяй. Адзіным хлопцам, якога сустракала заўсёды з неўтаймаванай цікаўнасцю і на павышаных эмоцыях, быў Паўл. Хапіла пачуць іх сакрэтнае *тэсць!* і Паўліна Ш. адчувала, што на яе налятае імпульс.

— О, Божа! — прамовіла мама, калі пабачыла сваю дачушку без „дрэдаў”. Спадарыня Ганна Ш. не магла зразумець, што сталася ў яе хаце якраз напярэдадні Каляд.

І, вядома, уцешылася яна: уміг зразумела, што яе дачушка дарастае.

— Ведаеш, мама, — пачала Паўліна Ш., — я спецыяльна чакала гэтага дня.

— А чаму?

— Як чаму? Бабуля сказала мне, што ўсё, што зробім і што падумаем на Каляды, збудзецца!

— О, Божа-Божа! — зноў ашарашылася Ганна Ш. Яна, як грунтоўная рацыяналістка, не любіла ўсякіх павер'яў і магічных пажаданняў. Наадварот, яе маці, значыць, бабуля Паўліны Ш.: для сеніёркі ўсё, што ў жыцці, налятала з неба або пекла.

— А скажы... ы... якіх ты, — цягнула маці, — якіх выглядаеш змен?

Паўліна Ш. толькі пацінула плячыма:

— Хачу памяняць імідж!

Паўліна хацела дадаць яшчэ нейкія словы, але ў той момант пазваніў тэлефон.

— Ці збіраешся да нас на Гагатуху? — спытаўся ў яе Паўл.

— Але я памяняла прычоску! — адрэзала гімназістка.

— То *тэсць*! — адказаў Паўл, а пасля хутка паправіўся ды павіншаваў: — То суперстар! Бо, ведаеш, я таксама памяняў фрыз.

(працяг будзе)

Арабінка

Вершы Віктара Шведа

У мяне яшчэ дзве сястрыцы

Дала цукеркаў суседка
Малой дзяўчынцы Ганулі.
— Што сказаць трэба, дзетка? —
Спытала яе матуля.

Збянтэжылася дзяўчынка —
Штось тут сказаць трэба быццам.
Сказала яна праз хвілінку:
— Маю яшчэ дзве сястрыцы.

Быццам у камісарыяце

Маці пытае Анатоля:
— Як адчуваеш сябе ў школе?
А хлопец адазваўся ў хаце:
— Быццам у камісарыяце.

Там сітуацыя такая,
Што ўсё пытаюць і пытаюць.
Пытанняў задаюць мне многа,
А я не ведаю нічога.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Польска-беларуская крыжаванка № 3

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 51: Бот, балет, дар, балада, Ала, латынь, ЕС, гіт, яна, канцэрт.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі: **Адрыян Анішчук, Эвеліна Белаказовіч, Патрыцыя Кандрацюк, Анна Кірылюк, Пётр Юрчук** з Бельска-Падляшскага, **Агата Барэчка, Януш Іванюк** з Нараўкі, **Эвеліна Ігнацюк, Іаанна Якімюк** з Чыжоў, **Павел Асіпюк** з Нарвы. Віншуем!



Царква-помнік у Новай Луцэ

У 2006 годзе настаяцель Стараляўкоўскай парафіі а. Леанід Янкоўскі будзе святкаваць 37-годдзе сваёй душпастырскай службы, з чаго 30 гадоў у Ляўкове. Прыход прыняў ён 1 чэрвеня 1976 года. У Стараляўкоўскім прыходзе меў тады 565 сем'яў і 1 800 душ. Цяпер тут пражывае 260 сем'яў (800 чалавек). Зараз тут больш чалавек памірае, чымсьці нараджаецца. Закрылі школу ў Старым Ляўкове.

Праваслаўная парафія Старое Ляўкова з'яўляецца адной з найстарэйшых. Царква была тут у 1505 годзе. У мінулым годзе ў свежаадмаляванай і з новай электраўстаноўкай адсвяткавалі 500-годдзе яе існавання. Заснаваў яе князь Масальскі. Дагэтуль захаваліся метрыкальныя кнігі з XVI і XVII стагоддзяў.

Зараз у складзе Ляўкоўскай парафіі 13 вёсак і вёсачак. У 1987 годзе заснавалі Новую Луку. Вёску Луку са 140 сем'ямі выселілі пад Семяноўскае вадасховішча. У Новай Луцэ жывуць былыя лучане. Ёсць звыш сотні дачаў, якія пабудавалі лекары, інжынеры, паліцыянты, дырэктары.

... І тут пабудавалі царкву — помнік выселеным людзям. Новая царква — другая ў парафіі (па той у Старым Ляўкове) — гэта ідэя настаяцеля. Царква пабудаваная дзякуючы вялікай ангажыроўцы маладых людзей — сыноў высяленцаў, але звязаных з зямлёй бацькоў. А было гэта так. У чэрвені 1999 года ўмуравалі краевугольны камень,

а праз два гады адбылася ў царкве святая літургія і былі асвячаны крыжы на купалах. У мінулым годзе пабудова храма была завершана. Людзі выбралі для яго патрона — прарока Ілью.

Такога грамадскага пачыну здаўна ў ваколіцы не было. Памагалі будаваць усе — парафіяне і дачнікі, праваслаўныя і каталікі. Насілі цэглы, мяшалі раствор, капалі, муравалі, прыбіралі. На паднос давалі па 5, 10 і 50 злотых, а потым прыходзілі дапамагаць у пабудове. Усе ахвотна працавалі, бо царкву будавалі для сябе.

Спонсараў знайшлося звыш 50. Той даў цэглу, той цэмент, хто іншы арматурную сталь і драўніну. Хтосьці дарма выканаў электраўстаноўку, хтосьці іншы купіў жырандолі і бра. Дапамагалі вялікія фірмы, вядомыя ў цэлым рэгіёне, і малыя, сямейныя бізнесы, шмат прыватных асоб. Яны хочуць застацца ананімнымі. Так як, напрыклад, адзін беластоцкі бізнесмен, вытворца мэблі. Ён заплаціў за пакрыццё даху, паркетную падлогу, тынкаванне ўсярэдзіне і звонку. Бляху на пакрыццё даху прывёз яго брат са Швецыі. Спонсары кажуць, што гэта рэлігійная справа.

Усе мясцовыя ды не толькі мясцовыя жыхары арганізоўвалі складчыну і будавалі. Шмат дапамагла, між іншым, сям'я Стоцкіх. Сын Яраслаў, які працуе надляснічым, дапамагаў падрыхтаваць пляцоўку пад царкву, паставіць падмурак. Ён таксама паклапаціўся пра лесаматэрыял. Ён і цэглу насіў. Усе Стоцкія купілі званы і ікону.

Пабудову штодзень пільнаваў Вячаслаў Каральчук, грамадскі старшыня камітэта пабудовы. Яго жонка Марыя была скарбнікам. Вячаслаў — земляроб на 20 гектарах, а да таго вопытны сталяр улюбёны ў гэтае рамяство. Ён зрабіў цэлы алтар з драўніны. Іканастас купілі ў Бельску-Падляшскім за сабраныя грошы.

Настаяцель марыў пра пабудову царквы-помніка высяленцам. І зараз яго мара здзейснілася. Настаяцелю Леаніду Янкоўскаму можна толькі пазайздросціць такіх парафіян.

— Калі добрыя людзі дапамогуць, — кажа настаяцель, — пры царкве стане яшчэ дом для дзяцей з бедных сем'яў. На дом месца пры царкве ёсць. Дзеці маглі б прыязджаць сюды летам і адпачываць. Тут вакол лес і вада, а да таго чыстае паветра, спакой і цішыня.

Сёлета споўніцца 30 год з таго часу, як а. Леанід Янкоўскі прыехаў прыняць Стараляўкоўскую парафію, тут пасяліўся і карыстаецца вялікай пашанай у прыхаджан. Усяго Вам добрага, айцец Леанід, у Новым годзе і на многія лета. **(мох)**

Я жыў у Дзуна

З вялікай прыемнасцю прачытаў я ў апошнім нумары „Нівы" мінулага ўжо года публікацыю Віктара Буры аб жыцці і працы Васіля Дзуна — вядомага раней беларускага дзеяча на Гайнаўшчыне.

Будучы вучнем Гайнаўскага ліцэя ў першай палове 60-х гадоў XX стагоддзя жыў я разам з калегам на кватэры ў Дзуна. Наш гаспадар у той час быў ужо пенсіянерам. Хачу напісаць аб тым, аб чым не напісаў Бура.

Васіль Дзун вельмі любіў літаратурную беларускую мову і штодзённа ёю карыстаўся. Польская мова ў яго добра не клеілася. Доўгімі зімовымі вечарамі настаўнік-пенсіянер чытаў творы беларускіх пісьменнікаў, якія браў у бібліятэцы.

Чытаў ён таксама рэгулярна „Ніву" і часам пасылаў у рэдакцыю свае разважанні аб мінулым і сучасным жыцці.

Васіль Дзун добра ведаў алгебру і нам, вучням, ахвотна тлумачыў цяжэйшыя алгебраічныя дзеянні, памагаў рашаць практыкаванні. За гэта памагалі мы яму цягнуць на рынак вазок з кветкамі, калі ішлі ранкам у школу. За дапамогай у матэматыцы звярталіся да нашага гаспадара таксама дарослыя людзі, якія вучыліся завочна ў сярэдніх школах.

Пенсіянер Васіль Дзун адзначаўся вельмі лагодным характарам: ніколі не злаваўся на людзей, многа жартаваў, расказваў забаўныя жыццёвыя анекдоты.

Быў ён таксама добрым мужам і бацькам: не іграў вечарамі ў карты, ненавідзеў п'янства, ганарыўся сваімі дзяржаўнымі ўзнагародамі. Усе яго дзеці закончылі вышэйшыя школы.

З таго часу, калі я жыў у Дзуна, прайшло больш за сорак гадоў, але і сёння я цёпла ўспамінаю гэтага заслужанага гайнавяніна, які паходзіў з Шымкаў Міхалоўскай гміны.

Мікалай Варанецкі

Штось не так

Быў я ў саборы ў Беластоку на набажэнстве і слухаў як бацюшка служыць на польскай мове. Падсумую коратка: не пасуе польская мова ў царкве. Пачуў я ад людзей, што нашы іерархі хочуць увесці унію. Прыкладам гэтаму можа паслужыць адрыўны каляндар на 2006 год, выдадзены з дазволу епіскапа, у якім святочныя трапары падаюцца на польскай мове.

Для календара „Нівы", відаць, не хапіла чырвонай фарбы, бо ўсе праваслаўныя святы памечаны чорнымі літарамі. Аб чым гэта сведчыць?

Дзядзька Захар

PS. Бачу, што вы не хочаце, каб я вам пісаў. Пытаюся: ці я горшы

ад Мікалая Панфілюка? Ён піша пра такіх герояў як Паўлік Марозаў, Кастусь Каліноўскі, а я хацеў пісаць і напісаў пра выбары. Я прадбачыў, што Сейм выбралі ненадоўга і так яно будзе. Хутка зноў пойдзем галасаваць. **Д. З.**

Ад рэдакцыі: Шаноўны Дзядзька Захар і Міхась Харкевіч. Дзякуем Вам і ўсім нашым чытачам за заўвагі наконт календара „Нівы". Нагадаю толькі, што ў мінулым годзе распіска ўсіх святаў і іх каларыстыка былі такімі ж як зараз. Вельмі нас цешыць, што нашым чытачам залежыць на як найлепшым выглядзе беларускага календара. Усе заўвагі рэдакцыя бярэ да сэрца і будзе памятаць пры складанні нашага выдання на 2007 год.

Згодна з абавязваючымі звычаямі ва ўсім свеце — выхадныя дні, нядзелі і дзяржаўныя святы значацца чырвоным колерам. Ствараючы каляндар, гэты фактар мы мусім улічыць, а таксама і тое, што царкоўныя святы не з'яўляюцца выхаднымі ў нашым будзённым коле дзён. Перасычанасць чырвонага колеру ў такім вызначэнні, магла б давесці да яшчэ большай блытаніны.

Рэдакцыя

Праваслаўныя калядкі ад „Царкоўнай музыкі"

Праваслаўныя калядкі — найбольш „ународнены" і папулярны від царкоўнай музыкі, які выконваецца ў час святаў Хрыстовага Нараджэння, — адзначае Мікола Бушко на новавыдадзенай кружэлцы з калядкамі *Kolędy prawosławne*. Калядкі гэтыя паходзяць з рэпертуару ўдзельнікаў Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы, запісанага ў прамым эфіры ў час конкурсных аглядаў у 1991-2005 гадах. Хоць май, калі агранізуецца Фестываль, не вельмі спрыяе выкананню калядных песень, шмат хораў — і царкоўных, і свецкіх (прымала ў фестывалі ўдзел больш за 500 хораў з 32 краін) — уключае іх у фестывальныя праграмы. Большасць калядак, прадстаўленых на кружэлцы гэта славянскія калядкі выконваныя хорамі з Польшчы, Расіі, Украіны і Беларусі, але ёсць таксама грузінскія і малдаўскія. На 28 калядак 14 гэта тутэйшыя — беларускія, падляшскія, м.інш. „Нарадзіўся Хрыстос Бог", „Учора з вячора", „Сёння ў месце Бэтлееме", „З неба Збаўца прыйшоў на зямлю", „А ўчора з вячора", „Свецяць, свецяць зорачкі", „Ой на моры, моры". **(лук)**



Вось такія былі пачаткі „Нівы”

- 4 -

Размова з Георгіем ВАЛКАВЫЦКІМ.

— Якія былі новыя пастаянныя рубрыкі ў „Ніве”?

— Мы стварылі дзіцячы куток „Малым сябрам”, пачалі весці „Гутаркі аб мове” (Баляслаў Манкевіч), збіралі фальклор, выяўлялі белыя плямы, дамагаліся беларускага выдавецтва, рыхтавалі да друку першы „Беларускі каляндар”, вярталі беларускай гісторыі загубленых герояў...

— Першым героем быў Зігмунт Бурчак-Абрамовіч (Антоні Забель) з першай тэатральнай беларускай трупы Ігната Буйніцкага...

— Пройдуць гады і я з задавальненнем прачытаю ў Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі: „Гэтыя ўспаміны і артыкул у газетах („Ніва”, 19.8.1958 г. і інш.) — найбольш грунтоўныя і дакладныя сведчанні пра дзейнасць Буйніцкага”. Дзейсную падтрымку ў асвятленні гісторыі і культуры Беларусі мы атрымалі ад беларускіх публіцыстаў Льва Мірачыцкага, Алеся Траяноўскага, гісторыка літаратуры Сцяпана Александровіча („К. Сваяцкага”), ад вярнуўшагася са ссылкі віленскага рэдактара і выдаўца Яна Шутовіча („Яна Дубневіча”).

— Перш за ўсё будзілі нацыянальную гордасць.

— Пераконвалі бацькоў не выводзіць са школ беларускую мову; бацькі-беларусы са Старога Ляўкова звярнуліся былі з такой просьбай у Міністэрства асветы!

— Пачалі выдавацца першыя беларускія кнігі. Далёка было яшчэ да бібліятэчкі „Белавежы” ці зборнікаў Праграмнай рады „Нівы”!

— У студзені 1957 г. ГП БГКТ выдала сваю першую кнігу. Гэта была прызначаная для мастацкай самадзейнасці „Паўлінка” Янкі Купалы. Пад канец таго месяца пад старшынствам Баляслава Манкевіча арганізаваўся Беларускі выдавецкі камітэт у Польшчы. Створаны былі дзве секцыі — мастацкай і гістарычна-навуковай літаратуры. Меркавалі выдаць п’есы для гурткоў мастацкай самадзейнасці, зборнік беларускіх народных песень, творы мясцовых аўтараў. Планы камітэта былі грандыёзныя, нерэальныя.

— Мінаў год дзейнасці. Аляксей Казёл рапартаваў: 6 павятовых аддзелаў, каля 1 000 членаў, 57 пачатковых беларускіх школ, у 111 школах беларуская мова як прадмет, 2 агульнаадукацыйныя беларускія ліцэі, у Міхалоўскім ліцэі беларуская мова як прадмет.

— Беларускай мове навучалася больш за 15 000 вучняў. Пры Настаўніцкай завочнай студыі ў Беластоку арганізаваны быў аддзел беларускай філалогіі, а пры Варшаўскім універсітэце — беларуская кафедра. Пры БГКТ працавалі Беларускі мастацкі калектыў песні і танца, тэатральны гурток, выдавецкі камітэт. Працаваў мастацкі калектыў і пры Варшаўскім аддзеле БГКТ.

— Адчувалася імкненне беларусаў да роднай мовы, песні і народнага танца. Беларусы ішлі ў будынак ГП БГКТ — „беларускі дом”. Дарэчы, рушыліся ўсе нацыянальныя меншасці. Ды і на вярхах да справы быў сур’ёзны падыход.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

— Мы стварылі дзіцячы куток „Малым сябрам”, пачалі весці „Гутаркі аб мове” (Баляслаў Манкевіч), збіралі фальклор, выяўлялі белыя плямы, дамагаліся беларускага выдавецтва, рыхтавалі да друку першы „Беларускі каляндар”...

— 4 сакавіка 1957 г. адбылося першае пасяджэнне Камісіі нацыянальных меншасцей ЦК ПАРП, такая камісія была створана і пры Ваяводскім камітэце.

— Ад самога гаварэння ды нарадаў вынікаў не будзе. На ўсё трэба грошы.

— Сакрат Яновіч намаўляў ГП спыніць гутарку аб „велічы беларускай нацыянальнай культуры” і заняцца гаспадарчай дзейнасцю, а гурткам БГКТ падказаў арганізаваць па вёсках Касы сялянскай самапомачы.

— У той сакавік дэбютаваў Віктар Швед вершам „Я беларус”, пачаў друкавацца „следапыт” Мацей Канапацкі. У красавіку выйшаў першы нумар дзіцячага дадатку „Зорка”. Паявіўся і Ян Чыквін („Янка Дубіцкі”). Былі і допісы з глыбінкі. За год у „Ніву” прыйшлі 3 124 лісты. „Ніва” з цяжкасцю прабіралася ў Беларусь, а трапляла без перашкод на Калыму!

— Прыходзілі адтуль усхваляваныя лісты. З Краснаярскага краю прыйшлі першыя вершы „Сібірака”. З’явіўся і ён сам, прадставіўся: „Шэршань”!

— „Ніва” прапанавала яднацца расцярушаным беларусам, якія за кавалкам хлеба апынуліся ў далёкім польскім старонні, арганізаваць нядзельныя школкі для дзяцей і вечаровыя курсы для дарослых.

— Наш паходны лозунг „Не саромцеся беларускасці” і на Беласточчыне папахваў утапічнасцю. Мая маці, даведаўшыся, што я стаў беларускім рэдактарам, сказала: „На беларускай справе яшчэ ніхто добра не выйшаў”!

BEZPŁATNY DODATEK DO 1 n-ru „NIWY”

ЗОРКА

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКІХ ДЗЯЦЕЙ У ПОЛЬШЧЫ

ШТОТЫДНЁВІК

№ 1(23) БЕЛАСТОК, 5 СТУДЗЕНЯ 1958 г. ГОД II

З Новым Годам

— Былі тэмы, якія асабліва цікавілі чытачоў.

— Добра ішлі ў нас справы з адкрываннем жывой гісторыі Падляшша. Сустрэчы з партызанамі апошняй вайны — да нас гэтай тэмы тут ніхто не кранаў. Заняліся таксама салдатамі Кастрычніка і грамадзянскай вайны.

— Адкрылі ў Новаберазове Якуба Мартынюка — матроса легендарнай „Аўроры”.

— Слава пра нашага героя дакацілася да Варшавы, затым да Масквы — і на яго грудзях павіс ордэн Леніна. Паспяхова прыходзіла і вяртанне культурнай спадчыны. Выраслі мясцовыя даследчыкі — Мацей Канапацкі, Васіль Белаказовіч, Аляксандр Баршчэўскі...

— Доўга „Ніва” сядзела разам з гэпістамі?

— Перабраліся мы са святліцы ГП 2 студзеня 1958 г. у новае рэдакцыйнае памяшканне па вуліцы Весялоўскага 1 (Сураская), пад канец таго месяца адзначалі мы соты нумар.

— Адчуванне было настолькі добрае, што праспявалі Вы гэпісцкаму начальству пару колкіх навагодніх „калядак”. На Прэзідыум ГП БГКТ, прысвечаны „Ніве”, Вы прыйшлі не чакаючы напасці.

— Гэта было якраз пасля публікацыі славутага абвінаваўчага акта ЦК ПАРП супраць рэдакцыі „Папросту”, пасля якога тыднёвік быў закрыты. Гальяш Федаровіч, не зазірнуўшы ў шпаргалку, знайшоў у „Ніве” ўсе крамольныя заганы „Папросту”. Былы сакратар Ваяводскай рады, пасля важны чыноўнік Управы ўнутраных спраў, карыстаўся ў нашым прэзідыуме вялікім аўтарытэтам. Усе глядзелі на мяне як на злодзея. Запытаўся я: „Ці вы чытаеце „Ніву”?” — „Не, не чытаю, але, добра пашукаўшы, і ў „Ніве” ўсё можна знайсці”. — „Дык шукайце!”

— Суд над „Нівай” адтэрмінавалі. Пацягнулі Вас у Варшаву на ацэнку прэсавых органаў у нацыянальнай камісіі ЦК ПАРП.

— Ехаў я ў Варшаву з найгоршымі прадчуваннямі. А тут хваляць. Але намылілі шыю за фотарэпартаж з Грабаркі.

— І гэтак за ўсе 32 гады працы на пасадзе галоўнага рэдактара, праводзіўшы „Ніву” крутымі зігзагамі па сваім напрамку! Пераглянуўшы падшыўкі, бачым, як „Ніва” рэагавала на рэальнасць... Хоць былі закіды, што „Ніва” ўзяла напрамак на старэйшага чытача, „Ніва” аўтаручкамі не абы-якіх майстроў давала рады...

— У адказ на артыкул Мікалая Тарасевіча „Больш увагі праблемам моладзі” пракацілася па стронках дыскусія. Узялі голас Лявон Майсяюк (арганізаваць беларускія джаз-клубы), Базыль Чачуга (аб вузенькіх нагавічках і ўласных аўтамашынах марыць не толькі наша моладзь), Мікалай Казак, Уладзімір Юзвюк (прапанаваў замест рок-н-рола вывучаць „Казачок” і „Каробушку”), а Валодзя Паўлючук пытаўся: „Чаму гэта рок-н-рол ці вузкія нагавіцы сведчаць аб маральным апусташэнні моладзі?”!..

(працяг у наступным нумары)

Размаўляла Міра Лукша

Насельніцтва Беларусі мае вельмі цьмянае ўяўленне аб асаблівасцях жыцця этнічных беларусаў у Польшчы. Часта такое становішча — вынік адсутнасці інфармацыі...

www.polszcza.com

Канец 2005 — пачатак 2006 года для беларускамоўнага Інтэрнэту застаў азнаменаваны прыемнай падзеяй, якая мусіць спрыяць не толькі пашырэнню ведаў пра жыццё беларусаў на Беласточчыне, але і ўмацаванню культурных, эканамічных і палітычных сувязяў паміж Польшчай і Беларуссю. Не сакрэт, што паспалітае насельніцтва Беларусі мае вельмі цьмянае ўяўленне аб асаблівасцях жыцця этнічных беларусаў у Польшчы. Часцей за ўсё такое становішча гэта не толькі вынік звычайнай чалавечай нецікаўнасці, а папросту адсутнасці лёгка даступнай інфармацыі. Часы, калі „Ніва" прадавалася ў газетных кіёсках у Гродне ці Магілёве, на жаль, прайшлі і пакуль не вяртаюцца. Пэўна таму, каб неяк прарваць інфармацыйную блакаду натуральна і штучна створаную за апошні дзесятак гадоў, Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь распрацаваў і стварыў сайт, які носіць даволі неардынарную назву „Polszcza.com". Адпаведна і месціцца ён у Інтэрнэце па адрасе http://www.polszcza.com.

Першая старонка сайта выглядае прывабна — на блакітным фоне неба, якое з правага боку набывае колеры польскага сцяга, размешчана назва сайта і пошукавая сістэма, якая, пэўна, яшчэ не пачала працаваць. Старонка мае традыцыйнае дзяленне на тры часткі. Асноўная, што месціцца пасярэдзіне, змяшчае назвы і пачаткі артыкулаў, з якімі можна падрабязней пазнаёміцца, клікнуўшы на адпаведны гузік. Добрым чыннікам для магчымасці прасачыць актуальнасць узнятай у тым ці іншым артыкуле праблемы ёсць датаванне матэрыялаў.

Левы бок першай старонкі, як і мае быць, аддадзены пад рубрыкі. Пакуль іх там не надта многа — усяго чатыры: „Гаспадарка", „Культура", „Палітыка" і „Грамадства". Ва ўсіх іх таксама месцяцца артыкулы, размеркаваныя па азначаных тэматыках.

Старонка „Гаспадарка" можа быць карыснай для бізнесоўцаў у Беларусі, якія мяркуюць завязаць нейкія дзелавыя кантакты з падляшскімі калегамі. Прыведзеныя артыкулы, зразумела, не падаюць адрасы і тэлефоны беластоцкіх ці гайнаўскіх фірм, але дазваляюць даведацца аб эканамічным і інвестыцыйным клімаце, існуючым у ваяводстве, параўнаць яго з беларускім.

Рубрыка „Культура" дае магчымасць пазнаёміцца з культурнымі асаблівасцямі беларускага падляшскага жыцця. Нягледзячы на суб'ектыўнасць аўтарскіх рэфлексій, яны ў сваёй нешматлікай пакуль большасці перадаюць цэлы каларыт мясцовых культурных рэалій, зазіраючы як у недалёкую гісторыю, так і ў сучаснасць, напрыклад, у рэчаіснасць беларускамоўнага навучання.

Аб палітычных аспектах прызваная распавесці адпаведная старонка сайта. Для інтэрнэтнага карыстальніка з Беларусі будзе цікава пазнаёміцца з імі праз артыкулы, якія напісалі аўтары — беларускія грамадзяне. Сугучная данай старонцы рубрыка „Грамадства" дае больш поўнае ўяўленне аб грамадска-палітычнай актыўнасці і дзеяннях грамадскіх актывістаў на карысць беларускай справы ў Польшчы.

З'яўленне сайта сталася магчымым дзякуючы падтрымцы польскага Міністэрства замежных спраў. Гэта дае падставы лічыць, што пасля брутальнага ўмяшання лукашэнкаўскай улады ў работу Саюза палякаў Беларусі, афіцыйныя ўлады Рэчы Паспалітай сталі больш зацікаўленыя ў спрыянні развіццю дэмакратыі за „Усходняй сцяной".

Уладзімір Лапцэвіч

Самым тытулаваным з беларускіх скакуноў можна лічыць Уладзіміра Алейніка. Ураджэнец горада Смалявічы, які даў беларускаму спорту нямала зорак...

Беларусь, беларусы...

Пераемнасці няма

Нядаўна споўнілася 70 гадоў з часу правядзення ў Беларусі першых афіцыйных спаборніцтваў па скачках у ваду. У тым жа 1935 годзе адбылася міжнародная сустрэча беларускіх і французскіх скакуноў. Самыя важныя міжнародныя спаборніцтвы праводзяцца на трохметровым трампліне і дзесяціметровай вышцы. У праграму кожнага мусяць уваходзіць серыі як абавязковых, так і адвольных скачкоў. Мужчыны выконваюць з трампліна 11 розных скачкоў, а з вышкі 10, жанчыны адпаведна 10 і 8. У сусветных скачках зараз усё больш пачынаюць дамінаваць кітайцы. У Беларусі ж гэты спецыфічны і тэхнічна складаны від спорту цяпер у крызісе. Але ў гісторыі былі значныя перамогі айчынных водных акрабатаў.

У часы СССР зборная Беларусі станавілася бронзавым прызёрам чэмпіянату „адной шостай часткі свету" (1977). Трэцяе месца было і на Спартакіядзе народаў СССР у 1979 годзе. А найбольшым камандавым дасягненнем было срэбра мужчынскай дружыны на Кубку Еўропы ў 1995 годзе.

Самым тытулаваным з беларускіх скакуноў можна лічыць Уладзіміра Алейніка. Ураджэнец горада Смалявічы, які даў беларускаму спорту нямала зорак, узышоў на п'едэстал манрэальскай алімпіяды ў 1976 годзе — трэцяе месца на вышцы. Праз чатыры гады ў Маскве Алейнік „пераплавіў" свой алімпійскі медаль на сярэбраны. Быў ён чэмпіёнам Еўропы і прызёрам першынства свету. А ў 1985 годзе падаўся ў фрыстайл — тады гэты від толькі нараджаўся. Як сапраўдны універсал здолеў яшчэ стаць чэмпіёнам і ўладальнікам Кубка СССР 1987 года па фрыстайлавых акрабатычных скачках. А дзесяць гадоў таму Алейнік выехаў на сталае жыхарства ў Аўстрыю, дзе па сённяшні дзень працуе трэнерам і выкладчыкам.

У тым жа Манрэалі бронзавы медаль на трампліне здабыў Аляксандр Касянкоў. Ураджэнец Мінска быў чэмпіёнам Спартакіяды народаў СССР (1979) і ажно дзевяць разоў чэмпіёнам Беларусі. Касянкоў таксама выехаў за мяжу.

Не менш вядомае імя і Аляксандра Партнова. На маскоўскай алімпіядзе ў 1980 годзе ён стаў чэмпіёнам. Пасля гэтага поспеху станавіўся чэмпіёнам Старога свету (1981) і бронзавым прызёрам чэмпіянату свету (1982). Сваіх перамог Аляксандр дабіўся пад кірункам свайго бацькі — вядомага трэнера Сталія Партнова. Сярод яго вучняў таксама ўдзельніца сеульскай алімпіяды Анжэла Стасюлевіч. Сталій Партноў памёр заўчасна, яго настаўніцкую справу ў Мінску працягвае цяпер сын.

З іншых варта назваць выхаванцаў мінскай школы скачкоў Святлану Аляксееву, бронзавую прызёрку чэмпіянатаў Еўропы на трампліне (1989, 1995), Сяргея Кудрэвіча, чэмпіёна кантынента на вышцы (1984), Андрэя Семенюка, чэмпіёна Еўропы (1989) і бронзавага медаліста першынства свету (1989), Вячаслава Хамулькіна, уладальніка Кубка Еўропы (1997). Апошні з'ехаў у 2000 годзе ў Бельгію. Так што пераемнасці ад былых чэмпіёнаў няма.

З 2002 года пераехаў і выступае за Беларусь расійскі скакун Сяргей Кучмасаў. У чатырнаццацігадовым узросце ён быў чэмпіёнам свету. Зараз вынікі не такія яркія. Але ў 2005 годзе на Кубку еўрапейскіх чэмпіёнаў у Стакгольме Кучмасаў выйграў спаборніцтвы на трампліне. А ў гэтай дысцыпліне ў беларусаў не было „залатога" поспеху ажно з 1996 года.

Уладзімір Хільмановіч

Тост

Трыццаць два долары, плакат з надпісам „Басовішча", тры бутэлькі гарэлкі (літровыя), кавалак сала, добры настрой і нявызначаная колькасць энергіі, лічба якой імкнулася да бясконцасці — гэта ўсё, што Ігар узяў з сабой. Дарэчы, гэта ўсё, што ў яго было ўвогуле. Для поўнага шчасця ён хацеў бы яшчэ мець квіток на зваротны шлях, але на такую дробязь шкада было губляць грошы. Малады хлапец, вясёлы, жартаўлівы, ён адразу стаў душой кампаніі ў асяродку сваіх аднагодкаў з Беларусі, якія прыехалі на Беласточчыну на традыцыйную імпрэзу беларускай песні „Басовішча". Ігара палюбілі за натуральную манеру трымацца і за яго жарты, якія самі нараджаліся пры кожнай размове. З ім было весела.

— Ну вось і мяжу пераехалі, — заўважыў нехта, весела гледзячы ў запацелае акно цягніка. — Ёсць прычына, каб выпіць!

— Няма прычыны, каб не выпіць, — удакладніў Ігар і тры пустыя бутэлькі, якія яшчэ паўгадзіны таму трэба было хаваць ад мытнікаў з-за іх поўнасці, пакаціліся па падлозе.

А яшчэ праз паўгадзіны Ігар паспеў прадаць свае трыццаць два долары, набыць у больш скупых і менш п'ючых суайчыннікаў чарговыя тры бутэлькі і, седзячы ля нераскладзенай палаткі, адзначыць той факт, што на „Басовішча", як і на кожную вялікую і шанаваную народам імпрэзу, збіраюцца дзве катэгорыі грамадзян. Адны, каб павесяліцца, другія, каб зарабіць на весялосці першых. І, падняўшы палец угару, глыбокадумна заўважыў, што кожная з тых дзвюх катэгорый людзей дзеліцца яшчэ на дзве — на сапраўдных апазіцыянераў, і на тых, хто імі толькі прыкідваецца. А зрабіўшы невялічкую паўзу, ён цяжка ўздыхнуў і дадаў, што сярод непітушчых, адсотак тых, хто прыкідваецца значна большы, чым сярод п'ючых. Пасля гэтага нейкі непітушчы юнак, у якога Ігар купляў „горкую" і які быў аматарам цвярозага ладу жыцця, нечакана для ўсіх выпіў адным махам цэлую шклянку гарэлкі, адразу зваліўся на зямлю ў нязвыклай для чалавека позе і так праляжаў аж да цемры.

Чым далей доўжылася свята, тым мацней падымаўся настрой. Ужо пры святле месяца Ігар падняў чарговы кілішак і засяродзіў увагу на тым, што паглынанне алкаголю без адпаведнага тоста, гэта проста банальная п'янка.

Прысутным вельмі спадабаўся такі падыход. У кагосьці з'явілася просьба, каб Ігар прыдумаў найлепшы тост усіх часоў і народаў, які неяк адпавядаў бы і „Басовішчу", і насіў адраджэнскі характар ды веліч беларускага духа.

Ігар ажно зморшчыў лоб, як пакрыўджаны гібонам арангутан. Яшчэ нічога і ніколі ён не прыдумваў на заказ. Яго жарты заўсёды ўзнікалі хутка, натуральна. З іх смяяліся іншыя і ён сам, і адразу пра іх забываліся. А тут прыдумаць нешта такое, што не забудзецца ніколі. Але набытую марку лепшага на „Басовішчы" веселуна, ад жартаў якога развязваюцца пупы нават у рыб, трэба было трымаць. Ігар так напружваў мазгі, што, здавалася, у галаве закіпела, а праз вушы валіць густая белая пара. А ў галаву, як назло, не завітвала ні адна думка. Ужо і надзея на нечаканы прыход Музы пачала знікаць, як раптам быццам хто стрэліў яму ў вуха з танка.

— Ёсць тост! — выгукнуў у адказ Ігар. — Найлепшы тост усіх часоў і народаў!

Твар Ігара свяціўся гонарам чалавека, які зрабіў тое, чаго іншыя не змаглі б ніколі. Ён падняў кілішак, і, выразна вымаўляючы кожнае слова, нібыта чаканіў манеты, агучыў усю фразу:

— За нашу і вашу Свабоду!

На яго здзіўленне ніхто не закрычаў: „О! Які тост!". І нават не страціў прытомнасці ад велічы пачутага. Наадварот. Усе сталі пераглядвацца са здзіўленымі тварамі. А аматар цвярозага ладу жыцця, што да гэтай хвіліны ўсё яшчэ валяўся п'яны ў нязвыклай для чалавека позе, прачнуўся з трыма пытальнікамі на павернутым да Ігара твары.

— Гэтыя словы, задоўга да цябе, сказаў Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка, наш славуты прашчур і нацыянальны герой, — урэшце пераклаў хтосьці на словы сэнс таго, што адбывалася.

— Прабачце, я не ведаў. Я быў перакананы, што гэта я толькі што стаў аўтарам гэтага выслоўя, — пачырванеў Ігар. Ён бачыў, што яго аўтарытэт знікае, як пясок у верхняй шклянцы сярэднявяковага гадзінніка. Трэба было тэрмінова выкручвацца з неспрыяльнай для яго іміджу сітуацыі. — У мяне ёсць яшчэ адзін, не менш вялікі тост, — бадзёрым голасам, які не прывык здавацца ад першага ўдару, задэкларавў ён. — Давайце вып'ем за нашых славутых продкаў. Вы толькі падумайце, як яны даўно жылі. Можна сказаць — у дзікія часы. А якія цудоўныя тосты казалі: „За нашу і вашу Свабоду!"

Генрых Западашмянскі

Прыручаў жалеза

Сяргей МАРОЗ са Спічкоў, які нарадзіўся ў Тапчыкалах у 1921 годзе, не толькі абрабляў зямлю-карміліцу, але і абрабляў прылады, якімі карысталіся земляробы.

Кавалём я стаў, расказвае, па сутнасці, самавукам. Пачатковую школу наведваў я ў Пашкоўшчыне, правучыўся там чатыры гады, а пасля закончыў сямігодку ў Орлі. З усяе вёскі ў сямігодку хадзіў толькі я, бо іншыя бацькі гаварылі, што няма з кім зямлі рабіць, або — папросту — што не трэба. У нашай сям'і было нас пецярых сыноў і адна дачка; бацька паслаў у школу мяне і пасля малодшага брата.

Пасля Орлі паступіў я ў механічную гімназію ў Беласток. Толькі я адзін з Тапчыкал у гімназіі вучыўся; і яшчэ адзін са Спічкоў быў. А на вёсцы тады многа ж здольнай моладзі было!

У гімназіі вучылі многа тэорыі, практыкі менш. За паўгода навукі трэба было трыццаць злотаў плаціць калі хто без двойкі быў, а калі з двойкамі — дзевяноста. За інтэрнат плаціць трэба было трыццаць злотаў у месяц, але я атрымліваў трыста злотаў у год стыпендыі за добрую навуку і гэта пакрывала закватараванне. Бацьку трэба было плаціць толькі за маю навуку.

Як насталі саветы, паслалі мяне ў паравознае дэпо ў Гродна. Там я тачыў усё на такарні для бягучых рамонтаў паравозаў. У Гродне працаваў аж да прыходу немцаў, жыў у прыватнай кватэры. Заглянуў голад, хадзіў у дэпо і там немцы давалі нам тое, чаго самі не з'елі. Я пасля двух тыдняў нямецкага панавання ўзяў пропуск і вярнуўся ў Тапчыкалы, дадому.

У Тапчыкалах паставіў я сабе невялікую кузню. Купіў бормашыну, невялікае кавадла і давай кляпаць. Спачатку плугі ладзіў, шыны на колы нацягаў, сашнікі данітоўваў, коней падкоўваў. Падковы гатовыя купляў і іх дапасоўваў да капыта, укручваў гакі, прыбіваў вухналямі. Прыязджалі да мяне сяляне з Пашкоўшчыны, Кошак, Градалёў. Хаця яшчэ і ў Дубяжыне каваль быў, але мне работы хапала.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Немец не бараніў каваць. Камісар нават на сваю гаспадарку ў Орлю не ўзяў мяне. І пасля вайны ніхто да майго рамяства не чапляўся. Пасля вайны ўжо вучобы не працягваў, абрабляў гаспадарку. Восем гадоў пасля жаніцьбы жылі мы ў Тапчыкалах, а пасля перабраліся на жончыну бацькоўшчыну ў Спічкі; тут я таксама пабудаваў новую кузню. Рабіў сабе ды і людзям машыны і трактары ладзіў. Раней паветра ў горан нагою наганяў, а нядаўна, пасля траўмы, падчапіў для гэтай справы пыласос.

А кран, што з зубамі для гною на панадворку стаіць, спярша працаваў у Беластоку, дзе я сваім чатыром дзецям дамы памагаў ставіць. І калі ён там стаў непатрэбным, то я яго для сваіх тут мэтаў прыладзіў. Бо люблю працаваць на зямлі, абрабляць. І яшчэ, хаця хаджу на мыліцах, але як узлезу на трактар і выеду ў поле, то мне гэта вялікая асалода.

І ў кузні ўсё яшчэ працую, бо рукі маю яшчэ моцныя. Вось цяпер раблю „гусіныя лапкі" заміж спружыноўкі, бо яна салому па полі цягне. І авечак крыху трымаю, каб панадворак ачысцілі, бо ніводная касілка так пад плотам не выкасіць, як авечкі. І сусед зрабіў праём у плоце, каб і яму нашы авечкі панадворак упарадкавалі.

Аляксандр Вярбіцкі

Сустрэча па тэлефоне

У нядзелю, 18 снежня, азваўся званок майго тэлефона. Жонка падняла трубку, а ў ёй мужчынскі голас спытаў пра мяне. Узяў я трубку і чую:

— Звоніць да Вас друг Ваш і сябра, а таксама верны сімпатык і друг пачэснай „Нівы", якую чытаю здаўна. Маё імя Валодзя, жыву ў Гайнаўцы. Хачу Вам, Мікалай, падзякаваць за матэрыялы, якія друкуюцца ў „Ніве". Я іх пільна чытаю, усе яны цікавыя, асабліва ж артыкул „Каліноўскі: герой ці разбойнік?"

Пачуўшы такую пахвалу, чалавек інакш сябе бачыць, чуе, што ён нешта варты. І я шчыра падзякаваў дзядзьку за тыя цёплыя словы. Па голасе я пазнаў, што гэта пажылы ўжо чалавек, і хацеў даведацца ягоных персаналій. Ён адказаў:

— Мо і не трэба мне ў цэласці адкрывацца, але і так я Вас цаню і веру ў праўдзівасць усіх Вашых артыкулаў, апублікаваных на старонках „Нівы".

Так мы загаварыліся па тэлефоне. Мой субяседнік вельмі любіць усіх ніўскіх аўтараў, цэніць нашых літаратараў, а асабліва Васіля Петручука. Мой суразмоўца назваў сябе верным і адданым беларусам ад крыві і касцей ды сказаў, што на цэлым свеце няма лепшай газеты за нашу родную „Ніву" (такога ж меркавання і я). Ён ад дошкі да дошкі яе чытае. З размовы можна было зрабіць выснову, што гэта адукаваны чалавек, які помніць міжваенны час і тугую тады долю беларускіх сыноў, якія сядзелі ў турмах і Картуз-Бярозе. Многа новага я даведаўся ад гэтага незнаёмага чалавека, так блізкага мне сэрцам і душою.

Мы гутарылі каля дваццаці хвілін і, можна сказаць, што ў нейкім сэнсе нават парадніліся. Хаця мы дагэтуль узаемна не бачыліся, але маю надзею, што гэта неўзабаве наступіць і дзядзька Валодзя прыедзе да мяне ў госці, каб ад сэрца пагаварыць пра нашы родныя справы.

А пакуль, жадаю Яму ды ўсім сябрам і сімпатыкам „Нівы" шчасця, радасці, здароўя і поспехаў у Новым годзе.

Мікалай Панфілюк

Абы не горш...

У 51 н-ры „Нівы" ад 18 снежня 2005 г. друкаваўся допіс Мікалая Панфілюка „Што пасеялі...", у якім аўтар прыводзіць выказванні людзей наконт выбараў і ацэнкі новай улады. Чытаючы тэкст я прыйшоў да высновы, што спадар Панфілюк або не разбіраецца ў справе, або не хоча прызнаваць сучаснай рэчаіснасці. Вось што піша: „А колішнія выбары былі ашуканствам ад пачатку да канца. Людзі былі там патрэбныя як ключка ў гаўне, абы толькі бюлетэнь укінуць у выбарчую скрынку". Ці штосьці перамянілася? На маю думку, нічога. Даўней кандыдата прывозілі „ў сумцы", гэта праўда. Зараз быццам бы народ рэкамендуе і выбірае. Але хто вызначае кандыдатаў? Лідэры партыі! Іхнія „любімцы" знаходзяцца першымі на спісках. Абранцы грамадства займаюць далейшыя месцы на спісках. Вядома, што пры нізкай яўцы выбаршчыкаў „праходзяць" кандыдаты, якія знаходзяцца ў першай дзесятцы.

Не цяжка зразумець, чаму грамадскасць абыякава ставіцца да гэтай справы, бо палітыкі мае яно па вушы, не бачыць „сваіх" кандыдатаў, якім можна даверыць. Амаль кожнаму чалавеку зразумела, што кандыдаты ў кампаніі абяцаюць грушкі на вярбе, але, як дарвуцца да карыта, дык аб абяцаннях забываюць ды хвастом прыкрываюцца. Далей спадар Панфілюк так піша: „А людзі, як гэта людзі, заўсёды наракаюць і часта гавораць недарэчнасці наконт улад, што там усе зладзеі і жулікі. Але я гавару ім, што калі б так у сапраўднасці было (...) тады ў Польшчы была б анархія, а мо і горш (...) Страшна было б выйсці на вуліцу з-за разбояў, царыў бы голад".

А што ж маем зараз, даражэнькія? Рай нябесны? Больш шасцідзесяці працэнтаў грамадства жыве ніжэй сацыяльнага мінімуму, палова з таго, за рысай беднасці. Амаль тры мільёны беспрацоўных. Увялічваецца лік бяздомных. Людзі паміраюць ад голаду. Кожнае трэцяе дзіця прыходзіць у школу галоднае. На вуліцу страшна адвячоркам выйсці. У белы дзень непадалёк жылога корпуса двух падросткаў забіла трынаццацігадовага хлопца, без прычыны. Увялічваецца насілле сярод непаўналетніх, адно ў 2005 годзе яны ўчынілі 25 забойстваў.

А як жывуць абранцы народа, парламентарыі? Лепш не гаварыць. Адны скандалы! У перыядзе шаснаццацігадовай трансфармацыі колькі іх было. Цяжка палічыць. І якому махляру, растратчыку грамадскай маёмасці волас упаў з галавы? Ніводнаму. А чаму б не канфіскаваць такому маёмасць? Дзяржаўны дэфіцыт паменшаў бы на мільёны злотаў. Зараз маем вялікую дзіру ў бюджэце. Не хапае грошай на медычную дапамогу, адукацыю і г.д. Наша дзяржава бедненькая. Дзякуючы людзям добрай волі, няўрадавым фондам і ўстановам, успамагаецца падкормліванне дзетак, купляецца неабходнае абсталяванне для шпіталяў.

У заканчэнні допісу спадар Панфілюк піша: „Як кажуць: які народ, такі і правадыр. Чаго людзі вартыя (...) такога маюць цара і такі збіраюць плён. Я (...) гавару: абы горш не было, як цяпер ёсць у нас. Яшчэ не трагедыя". А я кажу, паважаны калега, — спусціцеся на зямлю і паглядзіце якую маем рэчаіснасць.

Уладзімір Сідарук

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 700 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2006 r. upływa 5 marca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Навагодняе віншаванне

У пачатку кожнага года з даверам звяртаемся да Бога, просячы, каб нам блаславіў, каб нас сцярог, адорыў ласкай і мірам. Перад намі новыя надзеі і новыя апаскі пра будучыню.

Кожны чалавек скіраваны ў будучыню, жыве надзеяй, што будзе лепш, суправаджанай шматлікімі сумненнямі. Месца на сцяне заняў новы каляндар, але што далей? Многія задумоўваюцца, як жыць у той сумнай рэчаіснасці, калі не відаць выразнай паправы. На жаль, падобныя пытанні не абыходзяць і маладых людзей — ці варта вучыцца і штудзіраваць, калі цяжка атрымаць працу.

Радасцей мала, яны кароткія, а штодзённая пасрэднасць надта доўгая. Сумныя чалавечыя вочы, у якіх пагас пробліск надзеі, калі ўсё траціць сэнс і не радуюць нават ранейшыя поспехі. Лёгка сказаць: трымайся, не траць надзеі, аднак жа такія словы патрэбныя, бо даюць шанс паверыць ва ўласныя сілы, у дабрыню іншага чалавека, у Божую любоў. Бог не пакідае ні на хвіліну чалавека, суправаджае яго ў радасцях і трывогах, у працы і адпачынку, у здароўі і хваробе. Вера ў Бога бароніць чалавека перад акуннанем у бязвыхаднасць, перад трагічным сумняваннем, адыходам з галоўнай плыні жыцця. Пры многіх нагодах жадаем сабе здароўя, поспехаў і ўсяго найлепшага.

У нашым зямным вандраванні не можам прадбачыць многіх спраў, будучыня заўсёды з'яўляецца вялікай невядомасцю, а на невядомай дарозе добра мець прыяцеля. Найчасцейшымі пажаданнямі, якія чуем і якія выказваем, гэта: **„Ідзі з Богам", „Едзь з Богам", „Аставайся з Богам"**. Няхай тады Бог стане найпершым нашым прыяцелем, які не перастае нам давяраць, які дае нам шансы паправы, шматграннага ўзбагачэння. Ён да нічога нас не прымушае, шануе чалавечыя свабоду і гонар. Таму ў наступаючым годзе трэба паставіць яшчэ адзін крок у Ягоным напрамку. Найлепшае можа быць яшчэ перад намі.

А кім можа і хоча быць нам Хрыстос у новым годзе? Пра гэта маем згадкі ў Святым Пісанні.

„Назавеш Яго Ісусам, бо Ён збавіць людзей Сваіх ад іхніх грахоў" (Матф., 1:21). „Ягняткам Божым, які бярэ на Сябе грахі свету" (Ян, 1:29). „Веруючым Яму даў права сынамі Божымі называцца" (Ян, 1:12). „Дарогай, праўдай і жыццём; ніхто не мінае Мяне, калі прыходзіць да Айца" (Ян, 14:6). „Добрым пастырам, які жыццё сваё ставіць за авечак" (Ян, 10:11). „Вінаграднай лазой, а вы веткамі" (Ян, 15:5). „Я даю авечкам сваім жыццё вечнае і ніхто не захопіць іх з рук Маіх" (Ян, 10:28). „Хто падпарадкуецца волі Айца Майго Нябеснага, той Мне братам, сястрою і маці" (Матф., 12:50). „Уваскрэсеннем і жыццём; веруючы Мне, калі і памрэ, ажыве" (Ян, 11:25).

Гэтым усім можа і хоча стацца нам Хрыстос у новым годзе нашага жыцця, калі Яму даверым.

Міхал Мінцэвіч

Анатоль Парэмбскі

Шчодры вечар у Мастаўлян

Шчодры вечар, шчодры вечар
Жджэм цябе мы цэлы год
І не раз сабе намецім
Дзе і каму падстроіць плот

Каму брамку з плоту здымем
На суседаў кінем стог
Барану на клуню ўкінем
Гаспадар каб зняць не мог

А там дзе дзяўчына ў хаце
То напэўна будзе знак
Хто яе кахаці хоча
Ці багаты ці бядняк

Як багаты то ля хаты
Стане грубы клёц-таўкач
А як бедны то на тычцы
Пераломаны дзяркач

Ад прыгожанькай Марылькі
Ссыплем сцежку за сяло
Бо яе з суседняй вёскі
Любіць хлопец Васілёк

Яська з Валяй сцежка злучыць
Ясь кахання не скрывай
Бо каханне жыць навучыць
На зямлі пазнаеш рай

Асям, Элям чмут падкінем
Бо шкада лет марнаваць
Замужжа і так не міне
Лепей змоладу кахаць

Куль саломы разасцелем
Ганка Юлькава пыхціць
Спяць яны ў адной пасцелі
Хутка бусел прыляціць

Фанабэрыстай Веронцы
Уставім дзеда ля акна
Бо яна не любіць хлопцаў
Хай глядзіць на балвана

А калі набрыднуць штучкі
Да свайго бяжым кахання
Засядаем жа з радзінкай
І шчадруемся да рання

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — народную пагаворку.

1. кантора, офіс = 21 _ 9 _ 3 _ 4 _;
2. абрад памінання нябожчыкаў або драма Адама Міцкевіча = 10 _ 11 _ 12 _ 19 _ 20 _;
3. без агню не бывае = 23 _ 6 _ 7 _;
4. духоўны кіраўнік у мусульман = 14 _ 15 _ 2 _ 13 _;



5. імя Валэнсы = 8 _ 25 _ 1 _;
6. абраднае адзенне святара = 17 _ 16 _ 24 _ 18 _;
7. нязладжанае гучанне або пеністы налёт пры кіпенні = 5 _ 22 _ 26 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 49 нумара

Вац, Гаіці, жаніцьба, жоўць, зяць, Лаба, Об, рыцар, хват, цечка, юрта.

Рашэнне: **Багацце збіраць цяжка, ахоўваць трывожна і траціць балюча.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

15.01 – 21.01

Баран (20.03. — 19.04.) Да 17.01. нічога нікому не абяцай, калі не зможаш таго здзейсніць. Да 20.01. нічога належна не аформіш, таму важнейшыя справы адкладзі, каб не трэба было нічога адкручваць. Марс і Венера распаляць жарсці.

Бык (20.04. — 20.05.) Да 16.01. найбольш энергіі і аптымізму. Можаш занядбаць штосьці важнае або скласці пустыя абяцянні; праз гэта можаш аказацца малаверагоднай асобай. Прыемная атмасфера на працы; горш, калі вядзеш свой бізнес або кіруеш калектывам — некаторыя справы могуць уцячы з-пад кантролю.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Будзеце больш спакойныя і ўраўнаважаныя. Дзякуючы мастацтву дыпламатыі, кемлівасці і крутасці будзеце ззяць і зможаце шмат. Мілая атмасфера ў пары. Знакаміты настрой.

Рак (22.06. — 22.07.) Можаш адчуваць разгубленасць і пакінутасць. Шмат спраў убачыш у новым святле, а тое, што ўбачыш, табе спадабаецца. Не будзеш адчуваць сябе найлепш да 20.01.

Леў (23.07. — 22.08.) Да 16.01. будзеш ззяць у кампаніі. Будзе табе весціся ў асабістых, фінансавых і прафесійных справах. Памятай: пад канец месяца прыйдуць худзейшыя дні.

Дзева (23.08. — 22.09.) Добра выкарыстай гэты тыдзень, бо такіх нагод доўга не будзе. Рэалізуй праекты і планы. Калі не хочаш вярнуцца да таго, каго пакінула, дык парві ўсе кантакты. Іграй *fair* і не папракай людзей у памылках — яны, калі што здарыцца, заступяцца за цябе.

Шалі (23.09. — 22.10.) Можа вам трапіцца расчараванне ў каханні ці страціце давер да каханай асобы. Вашы патрабаванні ад партнёра, мабыць, завялікія. Дома — ідылія.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Непаразуменні і напружаная сітуацыя з партнёрам. Сварлівасць, бескампраміснасць. Збытак энергіі выкарыстай у больш канструктыўны спосаб.

Стралец (22.11. — 21.12.) Будзь вельмі асцярожны, не рызыкуй, не рвіся наперад занадта да 17.01. Ахвота пахадзіць па крамах, накупіць усяго (трапяцца добрыя нагоды). У пары пачуццё блізкасці душ.

Казярог (22.12. — 19.01.) Да 22.01. працяг знакамітага часу для наладжвання знаёмстваў, афармлянння важных спраў, вырашання праблем. Адкрыеш новыя таленты, падкрэсліш уласную непаўторнасць.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Да 17.01. папрокі блізкіх з-за твайго эгаізму і працагалізму ды прагі кар'еры коштам асабістага жыцця. Магчымы фінансавы поспех; чым больш маеш, тым больш яшчэ захочацца.

Рыбы (19.02. — 19.03.) 16-20.01. асцерагайцеся несумленных людзей. Благі час і на падарожжы, будзеце рассеяныя і нецярплівыя. Захочацца ажыццявіць ідэалы, памагчы іншым. Ваша ангажаванасць у кожную справу давядзе да таго, што атрымаеце больш, чым спадзяваліся.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960